

Зараз у сям'і Кавалёвых з Дубая вельмі напружаны час — жыхары раёна масава вязуць яблыкі на перапрацоўку. Перапрацоўка соку — сезонная справа. Пачынаецца яна звычайна ў жніўні і заканчваецца ў лістападзе.

МС



У кожнага жыхара Беларусі ёсць права на атрыманне якаснай пітной вады. Хаця ў кожнага свой погляд на тое, якую ваду спажываць — калодзежную, водаправодную ці ў бутэльках, фільтраваную альбо не.

МС



Не заўсёды выпадае магчымасць пабыць героямі тых кніжак, якія чытаў у дзяцінстве. Чатырнаццаць медыяперсон Беларусі на працягу трох месяцаў пераўвасабляліся ў казачных герояў з сусветна вядомых казак.

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ВЕРАСНЯ 2012 г. СЕРАДА № 181 (27296) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Ва ўрадзе

## НАКІРОЎВАЦЬ СРОДКІ Ў ЭФЕКТЫЎНЫЯ ПРАЕКТЫ

**ПРЭМ'ЕР-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч запатрабаваў накіроўваць сродкі ў ходзе мадэрнізацыі ў эфектыўныя праекты. Адпаведную задачу ён агучыў учора на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна, дзе разглядаліся вынікі інвестыцыйнай дзейнасці за студзень—ліпень 2012 года і задачы на астатні перыяд года.**

Пакуль прарыўных праектаў і ідэй у краіне вельмі мала, падкрэсліў кіраўнік урада. Аднак попыт на іх цяпер вельмі высокі. Міхаіл Мясніковіч запатрабаваў інвеставаць сродкі, найперш, у рэалізацыю такіх праектаў. «Калі мадэрнізацыя звядзецца да таго, што нават у неэфектыўныя і бесперспектыўныя прадпрыемствы зноў жа ўкладваць грошы, невядома, што мы атрымаем. Гэта не мадэрнізацыя, а марнатраўства, такога быць не павінна, — заявіў ён. — Таму трэба ў першую чаргу ўкладваць сродкі ў вытворчасці, якія будуць эфектыўнымі і заўтра, і праз 10 гадоў». У гэтай сітуацыі прэм'ер-міністр станоўча ацаніў работу некаторых банкаў, якія ажыццяўляюць дэталёвую ацэнку праектна-каштарыснай дакументацыі і праводзяць незалежную экспертызу бізнэс-планаў.

«Калі мы не забяспечым мадэрнізацыю прадпрыемстваў, калі не зменім падыходы па структуры эканомікі, то зразумела, што выходзіць на паказчыкі 2013 года і пяцігодкі будзе вельмі складана, — дадаў Міхаіл Мясніковіч. — У аснове ўсіх гэтых працэсаў інвестыцыйная дзейнасць». Менавіта на гэта звярнуў увагу і кіраўнік дзяржавы на нарадзе 11 верасня.

Разам з тым, шэраг міністэрстваў і аблвыканкамаў не выканалі запланаваныя паказчыкі. Прэм'ер-міністр папрасіў даць тлумачэнні, назваць прычыны. «Спасылацца на тое, што не хапіла або недастаткова бюджэтных ці крэдытных рэсурсаў, гэта не зусім аб'ектыўна, — падкрэсліў ён. — Калі дарагія рублёвыя крэдыты, у нас дастаткова замежных крэдытных ліній з невысокай працэнтнай стаўкай».

Як паведаміў міністр эканомікі Мікалай Снапкоў, пачынаючы з 2002 года ў Беларусі назіраліся высокія тэмпы інвестыцый у асноўны капітал. Калі за 2001—2005 гады ў эканоміку ўкладзена $20 млрд, ужо ў наступнай пяцігодцы (2006—2010) — у тры з палавінай разы больш, а гэта больш за $70 млрд. У 2011 годзе гэты аб'ём сродкаў дасягнуў $21,3 млрд. Доля інвестыцый у асноўны капітал у ВУП як асноўны паказчык пашыранага ўзнаўлення і індыкатар нацыянальнай бяспекі ў мінулым годзе склаў рэкордныя 36 працэнтаў.

У студзені—жніўні гэтага года ўзмацненне грашова-крэдытнай і бюджэтна-падатковай палітыкі, пэўнае скарачэнне крэдытавання дзяржпраграм аказалі стрымальны ўплыў на развіццё інвестыцыйнай сферы, канстатаваў Мікалай Снапкоў. За названы перыяд у эканоміку краіны ўкладзена Br85,8 трлн інвестыцый у асноўны капітал. Тэмп росту склаў 84,1 працэнта да ўзроўню студзеня—жніўня 2011 года. Па выніках года тэмп росту чакаецца на ўзроўні 91 працэнта. Адной з асноўных крыніц інвестыцый застаюцца бюджэтныя сродкі. Разам з тым, арганізацыі прыватнага сектара змаглі ў большай ступені зарыентавацца на знешнія крыніцы развіцця.

**Кар. БЕЛТА.**

# У ЧАКАННІ «ДАЖЫНАК»

**— Вы бывалі ў Горках? — спыталіся ў нас у ідэалагічным аддзеле Горацкага райвыканкама.**

**— Даводзілася.**

**— У такім разе глядзіце і параўноўвайце, — сказалі нам, арганізоўваючы экскурсію па горадзе...**

**Шчыра кажучы, неяк не запомніліся нам нечым асабліва адметным ранейшыя Горкі. Хіба, можа, не зусім утульнай гасцініцай з аднаго боку ды сваім сонечным гадзіннікам, устаноўленым на адной з цэнтральных вуліц горада, з другога. Апошні, як па-філасофску выказаўся кіраўнік Горацкага райвыканкама Ігар Макар, павінен нагадваць пра хуткацечнасць нашага часу, а за гэты час належыць (і можна) зрабіць вельмі многае...**

**Калі сказаць, што сённяшнія Горкі нас здзівілі — гэта будзе не зусім дакладна: яны нас проста ўразілі. У адной з інфармацыйных крыніц, якія нам прадаставілі, давялося прачытаць, што ўвод у Горках пэўных аб'ектаў (тут жа даецца іх вельмі шырокі пералік) дазволіць выйсці на еўрапейскі ўзровень абслугоўвання грамадзян. Гэтыя аб'екты ўжо дзейнічаюць. Яны і ў цэлым увесь горад з яго прыгожымі вуліцамі, плошчамі, скверамі і жыллёвымі кварталамі добра нагадваюць пра гэтыя самы, як прынята лічыць, найвышэйшы ўзровень. А можа, узровень Горак нават і яшчэ вышэйшы, бо Горкі да ўсяго — вельмі чысты горад.**





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



**Падчас нашага візіту ў Горкі тут, на ўездзе, узводзілася канструкцыя герба горада. Мантажнік Арцём Глухіх — адзін з тых, хто працаваў на гэтым аб'екце.**

**Цяпер у Горках ёсць вялікі амфітэатр і прыгожая набярэжная.**

Зразумела ўжо: у Горках вельмі добра пастараліся падрыхтавацца да галоўнага свята хлебаробаў краіны ды і ўвогуле — свята ўсіх сельскіх працаўнікоў — да рэспубліканскіх «Дажынак». І ў першую чаргу найвыдатным чынам абсталявалі свой галоўны аб'ект, прызначаны для сустрэчы высокіх гасцей і лепшых хлебаробаў краіны — амфітэатр, дзе і пройдуць усе адпаведныя ўрачыстасці. Дакладней, гэта моладзевы культурна-забаўляльны цэнтр з амфітэатрам. Увогуле, гэта ўнікальны аб'ект, падобнага да гэтага часу яшчэ не было. На ўваходзе ў цэнтр вас сустракае сімпатычная ратонда з каланадай, пад якой (пад зямлёй) знаходзяцца яшчэ тры паверхі з абсталяванымі там памяшканнямі пад кавярню, боўлінг, більярд, інтэрнэт-кавярню, танцавальную залу. А ад ратонды ідзе плаўны спуск у сам амфітэатр, на яго галоўныя пляцоўкі — трыбуны на 2500 месцаў і на сцэнічную пляцоўку ўнізе — пад авальным ажурным навесам. Прычым уся гэтая ўнікальная канструкцыя размешчана на беразе прыгожага вадаёма з узятым у камень бліжэйшым берагам і беластвольным і яшчэ зусім зялёным бярозавым гаем на другім беразе. А ўвогуле, гэта вельмі складаная задача — апісаць усю прыгажосць і ўнікальнасць названага аб'екта; ды яшчэ можна было б назваць і іншыя адметнасці, выкананыя тут у адзіным архітэктурным комплексе... Адным словам, тут якраз той выпадак, пра які кажуць: лепей адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць.

СТАР. 4

*ЛІЧБА ДНЯ*

***4 млн 571,2 тыс.***

*чалавек было занята ў эканоміцы краіны ў студзені—ліпені гэтага года. Гэта на 2,2% менш, чым у студзені—ліпені мінулага года, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Арганізацыямі (акрамя суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай формы ўласнасці) у студзені—ліпені было прынята на працу 478,4 тыс. чалавек, у тым ліку на дадаткова ўведзеныя працоўныя месцы — 28,4 тыс. Звольнена па розных прычынах 512,4 тыс. чалавек, з іх 6,9% — за прагул і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 24° |
| Віцебск | + 19° |
| Гомель | + 20° |
| Гродна | + 22° |
| Магілёў | + 18° |
| Мінск | + 21° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.09.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8390,00 | ▲ |
| Еўра | 10980,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 271,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1033,19 | ▲ |

## СЁЛЕТА ПАБУДАВАНА ЎЖО АМАЛЬ 3 МЛН КВ. МЕТРАЎ ЖЫЛЛЯ

**Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, сёлета за студзень—жнівень на будаўніцтва жылля выдаткавана 13 трлн рублёў інвестыцый у асноўны капітал. Арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 35,7 тысячы новых кватэр. За гэты час уведзена ў эксплуатацыю 2 млн 921 тысяча квадратных метраў агульнай плошчы жылля, што адпавядае 69,5 працэнта ад прадугледжанага задання на год.**

Больш за ўсё жылля за 8 месяцаў было здадзена ў эксплуатацыю ў Мінскай вобласці — 668 тыс. кв. м, у Мінску — 539,5 тыс. кв. м, у Брэсцкай вобласці — 532,7 тыс., у Гомельскай — 358,4 тыс., у Гродзенскай — 356 тыс., у Віцебскай — 251,5 тыс., у Магілёўскай — 214,9 тыс. кв. м.

Для грамадзян, што стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1 млн 659,7 тыс. кв. м жылля. За гэты час у сельскіх населеных пунктах пабудавана 671,5 тыс. кв. м жылля, або 23% ад агульнага аб'ёму па краіне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Выбары-2012

## НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ КРУГЛАСУТАЧНА ДЗЯЖУРАЦЬ МІЛІЦЫЯ І ПАЖАРНІКІ

**Учора стартавала датэрміновае галасаванне на выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. І адначасова з гэтым паўстала праблема забеспячэння грамадскай бяспекі і прадухілення рознага кшталту надзвычайных сітуацый падчас такой адказнай падзеі. Менавіта пра гэта ішла размова на сустрэчы МУС і МНС з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.**

СТАР. 2

■ «Прамая лінія»

## Усе пытанні грашова-крэдытнай палітыкі

**Сёння, 19 верасня 2012 года, з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Надзеі Андрэеўны ЕРМАКОВАЙ.** Калі вас хвалююць пытанні стабільнасці курсу беларускага рубля, захавання ўласных зберажэнняў, працэнтаў па ўкладах і крэдытах і любыя іншыя аспекты грашова-крэдытнай палітыкі нашай краіны — тэлефануйце!

Задаць пытанне падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефонах **8 (017) 292 38 92 і 8 (017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі info@zvyazda.minsk.by.

# МАЛАДОЕ ПАКАЛЕННЕ НЕ ЗАБЫВАЕ ГАЗЕТУ-ПАДПОЛЬШЧЫЦУ





**Школьнікі сталічных школ № 28 і № 76, прадстаўнікі адміністрацыі Савецкага раёна і жыхары інтэрната Мінгарвыканкама на вуліцы Беламорскай ушанавалі памяць журналістаў «Звязды», якія, ахвяруючы жыццём, выдавалі газету ў акупаваным немцамі Мінску. Да помніка газеце на вуліцы Кульман і да памятнай шыльды на доме па вуліцы Беламорскай былі ўскладзены кветкі, а настаўніца гісторыі Надзея Рудак расказала дзецям пра тое, як 70 гадоў таму, з мая па верасень 1942 года, былі надрукаваны чатыры нумары падпольнай «Звязды».**

■ Ад сувеніра да брэнда

## СЛУЦКІ ПОЯС БУДЗЕ ВЫРАБЛЯЦЦА ПА ВІЦЕБСКІХ РАСПРАЦОЎКАХ НА НЯМЕЦКІМ СТАНКУ

**«Быць ці не быць слуцкаму поясу?» — такое пытанне сёння не стаіць: навытканыя слуцкія паясы неўзабаве з'явяцца, папоўняць сувенірны фонд і стануць адным з галоўных брэндаў нашай краіны. Аднак тое, па якой тэхналогіі будуць вырабляцца паясы, на падставе якіх матэрыялаў і на якім абсталяванні, абмяркоўвалася на «круглым стале», арганізаваным Інстытутам культуры Беларусі.**

**Спецыяліст Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля АДАШКЕВІЧ** паведаміла, што праца па стварэнні новых слуцкіх паясоў ідзе поўным ходам.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КОЛЬКАСЦЬ АТАМНЫХ РЭАКТАРАЎ У БЛІЖЭЙШЫЯ 20 ГАДОЎ БУДЗЕ РАСЦІ





На гэтым тыдні ў Вене сабраліся дэлегаты 155 дзяржаў — членаў ААН для ўдзелу ў рабоце Генеральнай канферэнцыі Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі. Кіраўнік МАГАТЭ Юкіа Амана, спасылаючыся на апошнія прагнозы, сказаў, што ў бліжэйшыя 20 гадоў колькасць атамных электрастанцый будзе расці. «Большасць новых атамных рэактараў, якія плануецца пабудаваць або якія ўжо будуюцца, знаходзяцца ў Азіі. Такія традыцыйныя карыстальнікі, як Кітай, Індыя, Рэспубліка Карэя і Расійская Федэрацыя, плануюць значна пашырыць свае ядзерна-энергетычныя праграмы. Краіны, якія развіваюцца, па-ранейшаму праяўляюць вялікую цікавасць да ядзернай энергетыкі», — сказаў Юкіа Амана.

### СІРЫЙСКАЯ СВАБОДНАЯ АРМІЯ АБЯЦАЕ 25 МЛН ДОЛАРАЎ ЗА АСАДА

Сірыйская свабодная армія паабяцала ўзнагароду ў памеры 25 млн долараў таму, хто выдасць ёй прэзідэнта САР Башара Асада «жывым або мёртвым». Яна прыводзіць словы аднаго з камандзіраў ССА Ахмета Хіджазі. Ён растлумачыў, што гэтыя сродкі будуць выплачаны «сірыйскімі бізнэсменамі, якія працуюць у краіне і за яе межамі і якія падтрымліваюць ССА». Хіджазі дадаў, што ўзнагароджанне заклікана «заахвоціць да дзеяння членаў блізкага атачэння Асада».

Між тым мінулы месяц стаў самым крывавым з пачатку ўзброеных дзеянняў у Сірыі. Пра гэта заявіў спецкаардынатар ААН па блізкаўсходнім мірным працэсе Роберт Серы. Ні на пасяджэнні Савета бяспекі, ні пасля яго ў ходзе сустрэчы з журналістам ён не стаў удакладняць колькасць загінулых у САР у мінулым месяцы. Паводле ацэнак ААН, толькі за апошні тыдзень жніўня ў гэтай краіне былі забіты 1600 чалавек, а агульная колькасць ахвяр з пачатку канфлікту дасягнула 20 тысяч.

### ВА УКРАІНЕ ЗАБАРАНІЛІ РЭКЛАМУ ТЫТУНЮ

Ва Украіне з 16 верасня ўступіў у сілу закон аб забароне рэкламы тытунёвых вырабаў. Згодна з прынятым парламентам дакументам, ва Украіне будзе цалкам забаронена масавая рэклама цыгарэт у месцах іх продажу, у тым ліку ў інтэрнэце. З уступленнем закона ў сілу ўкраінцаў чакае яшчэ адна навіна: ужо ў кастрычніку на пачках цыгарэт з'явяцца жахлівыя карцінкі з магчымымі наступствамі для арганізма чалавека ад шкоды курэння. Таксама са снежня ва Украіне пачне дзейнічаць забарона на курэнне ў большасці закрытых памяшканняў, уключаючы офісы, бары, рэстараны і начныя клубы.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### НЕМЦЫ І ФРАНЦУЗЫ ЎСЁ БОЛЬШ ХОЧУЦЬ ВЯРТАННЯ МАРАК І ФРАНКАЎ

Большасць жыхароў Германіі незадаволеныя еўра: яны лічаць, што калі б іх краіна не карысталася гэтай валютай, іх матэрыяльнае становішча было б лепшым, сведчаць вынікі сацапытання, апублікаванага ў панядзелак медыяканцэрнам Bertelsmann.

Паводле апытання, так лічаць 65% рэспандэнтаў у Германіі, якія выказаліся за вяртанне нямецкай маркі. Акрамя таго, 49% апытаных немцаў упэўнены, што было б лепш, калі б Еўрасаюза наогул не існавала.

У Францыі ўдзельнікі апытання менш катэгарычныя па гэтым пытанні: усяго 36% рэспандэнтаў лічаць, што іх фінансавае становішча было б лепшым пры выкарыстанні франка, а не еўра. За жыццё па-за ЕС выказаліся 34% французаў.

Пры гэтым больш за 69% немцаў і 59% французаў думаюць, што Еўрапейскі саюз з'яўляецца ўзорам для астатняга свету.

Пра тое, што ў Германіі — вядучай эканоміцы ЕС — гатовыя абысціся без адзінай еўрапейскай валюты, у прыватнасці, заявіў кіраўнік Згуртавання нямецкіх экспарцёраў BGA Антон Бернэр. «Для нас важны свабодны рынак, а адзіная валюта неабавязковая. Ці ёсць жыццё ў Германіі пасля еўра? Так, ёсць», — цытуе яго сайт «Свабодная прэса».



КОРАТКА

Міжнародную акцыю «Дзень без аўтамабіля», якая пройдзе 22 верасня, многія навучальныя ўстановы Беларусі сустрэнуць спаборніцтвамі на веласіпедах, самакатах, роліках, скейтах, паведамілі ў Міністэрстве адукацыі.

Міністэрства аховы здароўя Беларусі зрабіла больш жорсткім санітарны нагляд за абаротам на тэрыторыі краіны алкагольнай прадукцыі чэшскай і польскай вытворчасці, паведамілі ў міністэрстве. Падроблены алкаголь, які паступіў у продаж у Чэхіі і які замест этылавага спірту ўтрымліваў метылавы, забраў жыцці 21 чэха. Таксама ахвярамі нелегальных гарэлкі і рому сталі чатыры жыхары Польшчы.

Міністэрства эканомікі Беларусі прапаноўвае прэміраваць кіраўнікоў дзяржорганаў за прыцягненне прамых замежных інвестыцый, заявіў учора кіраўнік міністэрства Мікалай Снапкоў.

# ЦІ ДАЗВАЛЯЕЦЕ ВЫ СВАІМ ДЗЕЦЯМ І ЎНУКАМ ЗНАХОДЗІЦЦА НА ВУЛІЦЫ ПОЗНА ВЕЧАРАМ?



**Анжаліка ПІСКУН, цырульнік:**

— У 16 гадоў ранавата быць самастойным. Мая дачка Анастасія ніколі не мела звычкі хадзіць на дыскатэкі, вечарыны, заседжвацца ў сябровак. Словам, з маленства была дамаседкай, праводзіла час за падрыхтоўкай урокаў, чытаннем кніг, камп'ютарам. Зараз ёй ужо 18 гадоў, вучыцца ў Мінску ў каледжы. Здавалася б, без кантролю бацькоў можна і памяняць свае звычкі. Але яна па-ранейшаму не імкнецца, як некаторыя яе равеснікі, у начныя клубы, кавярні, дыскатэкі. Галоўнае для яе — вучоба.

Згадваю часы свайго дзяцінства. Мне бацькі таксама не дазвалялі позна гуляць на вуліцы. У 9 гадзін вечара — адбой. На выхадных можна было гуляць максімум да 22.00. Так што сямейныя традыцыі ў нас перадаюцца ў спадчыну. Думаю, і дачка будзе выхоўваць сваіх дзяцей на такіх прынцыпах.



**Валерый БАРАДЗЬКО, будаўнік:**

— Рашэнне наконт абмежавання часу знаходжання непаўналетніх на вуліцы, з аднаго боку, правільнае. Няма ім чаго рабіць у позні час у тых жа пад'ездах, у месцах адпачынку — начных клубах, дыскатэках. Але ж бываюць сітуацыі, калі дзіця затрымліваецца недзе па аб'ектыўных прычынах, а бацькі не могуць яго сустрэць, паколькі ў гэты час, напрыклад, працуюць у начной змене.

Асабіста ў мяне двое дарослых дзяцей. Сыну 25 гадоў, дачка на два гады старэйшая. Іх свабоду я не абмяжоўваў, не забараняў гуляць і пасля 11 гадзін вечара. Магчыма, тады час быў іншым. І моладзь была не такая, як сёння. Цяпер падлеткі наглядзеліся фільмаў пра салодкае жыццё, не ўсе хочуць працаваць, а жыць мараць заможна. Дзеля дасягнення сваёй мэты могуць і ўкрасці, і злачынства здзейсніць.



**Галіна ЎЛАСІК, пенсіянерка:**

— У мяне сын ужо дарослы — 30 гадоў. У дзіцячым і падлеткавым узросце выхоўвалі яго так, каб нідзе позна не затрымліваўся. Бясспрэчна, наведваў ён і школьныя мерапрыемствы, вечарыны. Але яны заканчваліся, як правіла, раней 23, а школа была побач, у двары. Таму з выхаваннем не было ніякіх праблем. Цяпер жа час іншы, не такі спакойны. І калі б у мяне былі ўнукі, то я сама не дазваляла б ім гойсаць вечарам абы-дзе. Дзеці павінны ўвечары быць дома, нармальна адпачываць, каб назаўтра бадзёрымі пайсці ў школу.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ КРУГЛАСУТАЧНА ДЗЯЖУРАЦЬ МІЛІЦЫЯ І ПАЖАРНІКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— З 17 па 24 верасня загадам міністра ўнутраных спраў увесь асабовы склад пераведзены на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Гэта азначае, што работнікі міліцыі будуць несці службу кругласутачна, у тым ліку і на выбарчых участках, — гаворыць **начальнік Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Раман МЕЛЬНІК.** — Мы наладзілі кантакты з тымі ведамствамі, якія непасрэдна маюць дачыненне да правядзення галасавання, у тым ліку з выбарчымі камісіямі.

Пасля таго, як былі створаны выбарчыя ўчасткі, супрацоўнікі МУС правялі іх комплекснае абследаванне. Уласнікам тых устаноў, куды прыйдуць галасаваць людзі, было вынесена больш за дзве тысячы прапаноў, якія скіраваны на ўзмацненне іх абароненасці. Сур'ёзных прэтэнзій падчас абследавання не ўзнікла. Прадпісана абсталяваць пажарнай сігналізацыяй тыя месцы, дзе будуць захоўвацца бюлетэні, калі гэта тэхнічна магчыма выканаць. Акрамя таго, на базе органаў унутраных спраў і воінскіх часцей унутраных войск МУС створаны 11 участкаў для галасавання. Што датычыцца 124 устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы і спецыяльных устаноў міліцыі, то на іх тэрыторыі прадугледжана выдзяленне адпаведных памяшканняў для галасавання асоб, якія па заканадаўстве валодаюць выбарчым правам. Такім чынам, захады па забеспячэнні грамадскай бяспекі падчас правядзення выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь будуць выкананы ў поўным аб'ёме, запэўніў Раман МЕЛЬНІК.

— Міністэрства па надзвычайных сітуацыях правяло шэраг арганізацыйна-практычных мерапрыемстваў па кантролі забеспячэння пажарнай бяспекі на выбарчых участках. Як і ў МУС, асабовы склад будзе несці ўзмоцненую службу. Ва ўстановах, дзе будуць галасаваць людзі, арганізавана бесперапыннае дзяжурства нашых работнікаў, — паведаміў **кіраўнік упраўлення аварыйна-ратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый МНС Яўген ТАЧЫЛАЎ**. — Зроблены маніторынг супрацьпажарнага стану ўсіх аб'ектаў. Неабходны інструктаж праведзены не толькі з кіраўнікамі і ўласнікамі будынкаў, але і з членамі выбарчых камісій. Мы аказалі ўсю неабходную кансультацыйную дапамогу, а таксама правялі з асабовым складам дадатковыя заняткі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Гучная справа

# РАСКРЫЛІ ЗАБОЙСТВА ТАКСІСТА

**Забойства 20-гадовага віцебскага пажарнага, які ў вольны час афіцыйна перавозіў пасажыраў у таксі, раскрылі. Яго забілі ў Віцебску бліжэй да ночы. Дарэчы, меркаваны забойца сам больш за 15 гадоў працаваў у таксі. Апошнім часам яго не бралі на работу з-за злоўжывання спіртнымі напоямі. Паводле доказаў, якія ўжо ёсць у следчых, кіроўца сам дазволіў сесці ў машыну будучаму забойцу, які «галасаваў» на дарозе. Сярод іншага злачынца забраў каля 600 тысяч рублёў, якія, як потым прызнаўся, прапіў.**

Устаноўлена, што забойства ўчынена з прымяненнем агнястрэльнай зброі, хутчэй за ўсё з абрэза, які шукаюць. Усё гэта сведчыць пра тое, што да злачынства рыхтаваліся.

Забіты мог бы пастаяць за сабе. Ён быў спартсменам — добра валодаў прыёмамі ўшу, пры сабе ў аўто меў траўматычны пісталет...

— З моманту забойства да моманту затрымання падазронага прайшло два дні. 13 верасня была распачата крымінальная справа. Пры аглядзе месца злачынства эксперты высветлілі, што забілі маладога хлопца з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі і вострага прадмета. Устанавілі асобу падазронага, якога затрымалі. Ён таксама жыве ў Віцебску, 1971 года нараджэння, мае крымінальны «вопыт»: судзімасць за ўгон, — расказвае Уладзімір Шалухін, начальнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці. — Зараз падазроны ўзяты пад варту. Вырашаецца пытанне аб прад'яўленні яму абвінавачвання па артыкуле Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь, які прадугледжвае адказнасць за наўмыснае забойства з разбойным нападам...

Пакаранне за такое злачынства прадугледжана жорсткае: пазбаўленне волі тэрмінам да 25 гадоў, пажыццёвае заключэнне або смяротная кара.

Кіраўнікі Следчага камітэта Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама падкрэсліваюць, што вялікую дапамогу ў расследаванні аказалі гараджане, асабліва кіроўцы таксі. Адзін з таксістаў расказаў, што вёз пасажыра, на адзенні якога былі бурыя плямы, падобныя на сляды крыві.

У Віцебску забойства выклікала рэзананс. Сябры нябожчыка праз інтэрнэт аб'явілі аб зборы сродкаў для сям'і загінулага.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

# СЛУЦКІ ПОЯС БУДЗЕ ВЫРАБЛЯЦЦА ПА ВІЦЕБСКІХ РАСПРАЦОЎКАХ НА НЯМЕЦКІМ СТАНКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэтам праведзены навукова-даследчыя работы па праекце «Распрацоўка тэхналогій вырабу аналагаў слуцкіх паясоў». Для іх вытворчасці вырашана выкарыстоўваць сучаснае ткацкае абсталяванне, таму з германскай фірмай «Магеба» заключаны кантракт на набыццё сучасных станкоў. Расказала Наталля Адашкевіч і пра тэхналогію вытворчасці:

— Варыянт пошуку і набыцця аўтэнтычнага станка і вырабу слуцкіх паясоў менавіта на ім разглядаўся не толькі Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта, але і Акадэміяй навук, і Нацыянальным мастацкім музеем. Аднак было вырашана, што ўзнаўляць працу старога станка будзе нашмат даражэй, чым набыць новы з тымі тэхнічнымі характарыстыкамі, якія патрэбны для стварэння слуцкага пояса. Сама тэхналогія вытворчасці стваралася Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэтам, пасля зацвярджалася і Інстытутам мастацтвазнаўства, і Міністэрствам культуры. Пакуль распрацавана тэхналогія толькі аднаго пояса, які знаходзіўся ў Інстытуце мастацтвазнаўства, — таго, што можна было ўзяць, разгледзець пад мікраскопам, вывучыць. У далейшым кожны новы пояс таксама будзе ствараццa толькі пры наяўнасці арыгінальнага вырабу. Такім чынам, пад кожны гістарычны выраб будзе ствараццa асобная тэхналогія.

Наталля Адашкевіч запэўніла, што гэта толькі пачатковы этап працы, і дадала, што ў праграме ёсць пункт, згодна з якім наша краіна, верагодна, будзе набываць арыгінальныя паясы ў замежных калекцыянераў, музеяў. Пра тое, што набыццё аўтэнтычных слуцкіх паясоў і стварэнне асобнага музея, — надзвычай важны пункт праграмы, гаварыла **начальнік аддзела Інстытута культуры Беларусі Ала СТАШКЕВІЧ:**

— Мы маем зусім небагатую калекцыю слуцкіх паясоў — толькі 11, але і з іх не ўсе рабіліся ў Слуцку. І як мы можам пры наяўнасці такой нерэпрэзентатыўнай калекцыі траціць дзяржаўныя сродкі на адраджэнне паясоў, калі на гэтыя грошы можам купіць некалькі калекцый слуцкіх паясоў і ганарыцца імі? Ніколі копія не будзе раўназначнай па каштоўнасці арыгіналу. З цягам часу арыгінал будзе толькі ўзрастаць і ў кошце, і ў каштоўнасці. Копія Рэмбрандта нічога не вартая на аўкцыёне, у той час як сам Рэмбрандт — гэта некалькі мільёнаў долараў! Тое ж і з нашымі слуцкімі паясамі. Таму закупка на аўкцыёнах, на маю думку, павінна быць прыярытэтным напрамкам праграмы.

**Доктар філалагічных навук, прафесар, супрацоўнік Інстытута культуры Беларусі Адам МАЛЬДЗІС** таксама адстойваў аўтэнтыку: ён выказаў меркаванне, што для вырабу сучасных паясоў варта адшукаць аўтэнтычны ткацкі станок таго часу. Супаставіўшы ўсе факты, Мальдзіс зрабіў выснову, што найбольш верагодна адшукаць станок, адпаведны слуцкаму, у Стамбуле:

— Як вядома, Маджарскія (майстры-ткачы XVIII—пач. XIX ст. — бацька і сын, арандатары Слуцкай фабрыкі князёў Радзівілаў, на якой выраблялiся слуцкія паясы. — **Аўт.**) прыехалі з Турцыі. Таму мы вялікую надзею ўскладаем на гэту краіну, бо ў Стамбуле могуць быць аўтэнтычныя станкі, на якіх ткаліся і персідскія, і пасля слуцкія паясы. Бо мы ведаем, што Маджарскія прывезлі з сабой на Беларусь адзін ткацкі станок, а пасля мясцовыя ўмельцы па гэтым узоры зрабілі яшчэ некалькі дзясяткаў.

Адам Мальдзіс распавёў і пра тое, што пачаць пошукі аўтэнтычнага станка не так ужо і складана. **Генеральны дырэктар грамадскага аб'яднання «Дыялог Еўразія» ў Беларусі Іхсан ДЫЛЕКЧЫ** яшчэ раней паведаміў, што можна проста зрабіць ксеракопіі выяў нашых слуцкіх паясоў і па электроннай пошце адправіць спецыялістам у Стамбул. На падставе гэтага можна будзе паспрабаваць адшукаць аўтэнтычны станок.

Яшчэ адно верагоднае месцазнаходжанне аўтэнтычнага станка — французскі горад Ліён, дзе ў тыя часы выраблялiся аналагі слуцкіх паясоў:

— У II палове XIX ст, калі слуцкія паясы ўжо перасталі быць моднымі (на змену сармацкаму стылю адзення прыйшоў еўрапейскі), — удакладніў Адам Мальдзіс, — паясоў было выраблена шмат, іх на ўзбраенне ўзялі жанчыны. У альбоме Вольгі Дзёмкінай «Музей тканін у Ліёне» можна бачыць, як у парыжскіх жанчын да зямлі звісаюць паясы — вось як, аказваецца, можна выкарыстаць слуцкія вырабы.

Па прыездзе ў Ліён Вольга Дзёмкіна (прадстаўніца беларускай дыяспары ў Францыі, мастачка. — **Аўт.**), абяцала зрабіць усё, каб адшукаць арыгінал станка, які, пэўна ж, захаваўся, калі там ёсць музей ткацтва XVIII ст. Ёсць здагадкі і пра тое, хто прывёз ткацкі станок у Ліён:

— У Гродне, прыехаўшы з Ліёна, працаваў Жылібер — вядомы батанік, лекар. У 90-х гадах XVIII ст. ён вярнуўся ў Ліён. Верагодна, што ён павёз з сабой станок. Таму я маю надзею, што ў Ліёне ў музеі ткацтва або ў мэрыі, дзе таксама выстаўлены старадаўнія станкі (бо іх вырабы з'яўляюцца французскім брэндам), можа адшукацца аўтэнтычны станок, — сцвярджае Адам Мальдзіс.

Выраблялiся паясы па тыпу слуцкіх і ў Польшчы, і ва Украіне, але там адшукаць старадаўнія станкі, на думку даследчыкаў, малаверагодна. Затое паехаць туды, каб вывучыць тэхналогію стварэння слуцкага пояса, неабходна, на думку **кандыдата мастацтвазнаўства Маі ЯНІЦКАЙ:**

— У Беларусі тэхналогія вырабу слуцкіх паясоў грунтоўна нікім не даследавалася. Мы маем толькі павярхоўныя звесткі, якія існавалі ў XIX ст., пра тое, што гэты беларускі брэнд стаў настолькі папулярным у Еўропе, што дзясяткі гарадоў сталі вырабляць гэтыя паясы, і кожны рабіў па сваёй тэхналогіі: толькі знешні ўзор (арнаментацыю, кветкі) крыху мянялі, а кампазіцыю захоўвалі. А сёння найбольш вывучаны слуцкія паясы ў Польшчы. Ядзвіга Хрушчынская даследавала больш за 200 паясоў, якія захоўваліся ў варшаўскім музеі. І калі яна вывучыла тэхналогію вырабу кожнага з іх, аказалася, што толькі некалькі дзясяткаў з'яўляюцца слуцкімі паясамі. Іх тэхналогія была ўнікальнай, яе ніхто не мог паўтарыць, хоць выраблялiся паясы яшчэ на 20 мануфактурах. З тых 200 паясоў, даследаваных Хрушчынскай у Польшчы, два нават мелі подпіс «Слуцк», але былі фальсіфікацыяй. Уяўляеце, якое трэба правесці даследаванне, каб выявіць сапраўдныя паясы? І ўсё тое, што мы маем і лічым слуцкімі паясамі, могуць такімі і не з'яўляцца. Мы нават не ведаем, які слуцкі пояс сапраўдны. Таму трэба спецыяліста Інстытута мастацтвазнаўства Марыю Віннікаву, якая вывучала тэхналогіі ткацтва, паслаць у Варшаву азнаёміцца з гэтымі двума дзясяткамі паясоў, якія сапраўды з'яўляюцца слуцкімі. Неабходна пачакаць, пакуль яна вернецца са сваімі ведамі, а пасля і станок выкарыстоўваць, і матэрыялы набываць.

Нягледзячы на розныя меркаванні, цягнік, як заўважалі на «круглым стале», ужо пайшоў. Нагадаю, што 8 мая 2012 у пасланні Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі прагучала, што неабходна ўзнавіць вытворчасць славутых слуцкіх паясоў, адрадзіць рамяство і зрабіць яго сучасным брэндам. Зыходзячы з гэтага распрацавана канцэпцыя адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы». На яе падставе да 15 кастрычніка ў Савет Міністраў павінна быць прадстаўлена канкрэтная праграма на 2012—2015 гады.

Як бачна, у выкананні гэтага дзяржаўнага заказу ёсць два бакі: падсправаздачны і творчы — калі першы нельга не выканаць, то другі немагчыма прыспешваць. Будзем спадзявацца, што праца з нацыянальным брэндам дапаможа ўсім зацікаўленым асобам аб'яднацца.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# ПРАДСТАЎНІКІ ПАРТЫЙ, ЯКІЯ ЗНЯЛІ КАНДЫДАТАЎ, ПАЗБАЎЛЕНЫ МАНДАТАЎ ЦВК

**УЧОРА на пасяджэнні ЦВК пытанне аб страце Ігарам Ляльковым (БНФ) і Віктарам Карнеенкам (АГП) паўнамоцтваў члена Цэнтральнай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання было адным з першых на парадку дня. Аднак да галасавання па ім усе прысутныя паспелі пачуць некалькі палітычных заяў і спрэчак. І нават сталі сведкамі аднаго дэмаршу.**

Ігар Лялькоў адразу ж прапанаваў змяніць парадак дня, выключыўшы з яго разгляд свайго звароту ад 5 верасня аб уключэнні ў Савет па СМІ незалежных журналістаў, паколькі заява страціла сваю актуальнасць — перыяд агітацыі скончаны і распачата папярэдняе галасаванне.

«Мы, калі прымалі гэту заяву, казалі, што разглядзім яе на пасяджэнні назіральнага савета і вынесем на бліжэйшае пасяджэнне ЦВК, — патлумачыла сітуацыю з надта познім разглядам заявы Лялькова старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына. — Што і выканалі. Сённяшняе пасяджэнне ЦВК — бліжэйшае. Так склаўся графік працы ЦВК: мы не можам дзеля адной заявы збірацца, бо 4 члены з 12 прыязджаюць з розных рэгіёнаў. Калі б мы былі прафесійным органам, а не грамадскім, тады магчыма было б разгледзець яе і раней».

Адразу ж пасля змены парадку дня сябар партыі БНФ зачытаў заяву аб спыненні сваіх паўнамоцтваў у Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу, патлумачыўшы гэта тым, што «ў краіне існуюць вязні сумлення, а ў працэдуры выбараў няма дастатковых захадаў для выключэння фальсіфікацый». На гэта Лідзія Ярмошына заўважыла, што пазбаўленне мандату ў выпадку, калі партыя здымае ўсіх сваіх кандыдатаў, прадугледжана заканадаўствам. Пазней яна заяву спадара Лялькова назвала палітычным дэмаршам, у якім не было неабходнасці: «У дачыненні дваіх гэта называецца: «я кіну цябе, пакуль ты мяне не кінуў».

Аднак вакол фігуры Віктара Карнеенкі, прадстаўніка Аб'яднанай грамадзянскай партыі, якая таксама зняла ўсіх сваіх кандыдатаў, разгарнулася спрэчка. Член ЦВК з правам дарадчага голасу ад партыі левых «Справядлівы свет» Сяргей Калякін запярэчыў старшыні, указваючы, што адпаведны артыкул закона не забараняе Віктару Карнеенку заставацца членам ЦВК. Тым не менш большасць прагаласавала за пазбаўленне Карнеенкі мандата.

«Калі звярнуцца да першакрыніц, то членства ў Цэнтральнай выбарчай камісіі з правам дарадчага голасу даецца прадстаўніку палітычнай партыі, якая вылучыла сваіх кандыдатаў і ўдзельнічае ў выбарах. Сёння мы маем афіцыйныя дакументы АГП пра зняцце ўсіх сваіх кандыдатаў з выбараў, адпаведна і падставы для працягвання паўнамоцтваў Карнеенкі вычарпаныя», — запэўніў удзельнікаў пасяджэння сакратар ЦВК Мікалай Лазавік.

Другім спрэчным пытаннем на пасяджэнні стала скарга кандыдата ў дэпутаты Андрэя Юркова ад Горацкай выбарчай акругі №82, якому Акруговая выбарчая камісія вынесла папярэджанне з-за парушэння правіл агітацыі: яго друкаваная прадукцыя не мела усіх, прадугледжаных законам, выхадных звестак. Справа ў тым, што Андрэй Юркоў вырабіў лістоўкі з дапамогай лічбавага друку, які не мае патрэбы ў ліцэнзаванні, аднак кодэксам прапісана абавязковая спасылка на ліцэнзію вытворцы такой прадукцыі. Сяргей Калякін палічыў, што грубага парушэння кандыдат не здзейсніў, аднак з ім не пагадзіліся ні юрысты, ні іншыя члены ЦВК.

Апошняе пытанне было разгледжана без дыскусій, яно тычылася магчымасці прагаласаваць грамадзянам Беларусі, якія пастаянна пражываюць за мяжой, на радзіме. Катэгорыя такіх людзей вельмі нешматлікая, гэта часцей за ўсё прадстаўнікі дыпламатычных місій, якія ў дзень выбараў аказаліся ў Беларусі. Яны змогуць прагаласаваць на выбарчых участках па месцы сваёй часовай рэгістрацыі.

У размове з журналістамі Лідзія Ярмошына была засмучана фактам зняцца з выбараў кандыдатаў ад дзвюх партый:

— Бюлетэні з паметкамі «выбыў», заклееныя інфармацыйныя плакаты, занадта позняе інфармаванне выбарчых камісій — усё гэта не на карысць выбарам, — сказала яна. — Але ўсё гэта не пытанне тэхнікі, пытанне палітыкі. Кепска, калі няма альтэрнатывы, калі акругу прадстаўляе адзін кандыдат. Калі кандыдаты, якія засталіся, не змогуць набраць 50% галасоў выбаршчыкаў, то выбары ў гэтай акрузе не адбудуцца, як не адбыліся б яны, калі б ніхто з 2 кандыдатаў не набраў абсалютнай большасці галасоў.

Па папярэдніх звестках ЦВК, толькі ў Мінску і Віцебскай вобласці няма безальтэрнатыўных акруг.

Разам з тым, старшыня ЦВК выказала надзею, што выбары пройдуць ў добразычлівай абстаноўцы, а выбаршчыкі будуць актыўнымі. Ужо ўвечары 18 верасня з'явяцца першыя звесткі па датэрміновым галасаванні.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## АБЗАЦ

◢ Па амністыі ў Беларусі вырашана вызваліць ужо амаль 2 тыс. чалавек. Па звестках МУС, у дачыненні да 4099 чалавек прынята рашэнне аб скарачэнні тэрміну пакарання на 1 год. Адмоўлена ў прымяненні амністыі 4810 асуджаным. А ўсяго пад амністыю падпадалі 14938 чалавек.

◢ **Да красавіка 2013 г. плануецца падрыхтаваць нарматыўна-прававы акт, якім будзе прадугледжана адміністрацыйная адказнасць за правядзенне экскурсій без атэстацыі і парушэнні заканадаўства ў галіне турызму. Па звестках на 1 жніўня, у Беларусі налічваецца 1142 экскурсаводы і 941 гід-перакладчык. Больш за ўсё іх у Мінску — 346 экскурсаводаў і 158 гідаў-перакладчыкаў.**

◢ Беларускія сталоўкі нарэшце вызваляцца ад алюмініевага посуду. Як адзначаецца ў новай рэдакцыі інструкцыі па класіфікацыі гандлёвых аб'ектаў грамадскага харчавання, зацверджанай пастановай N22 Мінгандлю Беларусі, «у мэтах павышэння культуры абслугоўвання ў сталоўках вытворчых арганізацый і ўсіх навучальных устаноў уведзена патрабаванне аб выкарыстанні сталовага посуду толькі з нержавейнай сталі, выкарыстанне алюмініевых прыбораў не прадугледжана».

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **Амерыканскі ваенна-марскі флот узяў на службу 60 казлоў. Місія ў іх стратэгічная — выратаваць марскія базы ад пустазелля. Справа ў тым, што порт у Сан-Францыска церпіць з-за велізарных палёў з засохлай травой. Вайскоўцы хвалююцца, бо сітуацыя пажаранебяспечная. На дапамогу салдатам прыйшлі козлікі, якіх выкупілі з бойні. Цяпер статак атрымлівае 400 долараў за тыдзень працы. А іх гаспадар, вядомы сярод гараджан як пастух Трэвер, абышоў 200 іншых прэтэндэнтаў і зараз ганарыцца сваёй працай. Ён кажа, што вынайшаў экалагічна чысты спосаб барацьбы з пустазеллем.**



*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# БЫЛЫ МАГІЛЁЎСКІ ЧЫНОЎНІК АСУДЖАНЫ ЗА ЗЯМЕЛЬНУЮ АФЕРУ

**Былы намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір Ціток асуджаны на 3 гады з канфіскацыяй за перавышэнне ўлады і крадзеж. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ва Упраўленні КДБ па Магілёўскай вобласці.**

Паводле інфармацыі КДБ, курыруючы работу будаўнічай галіны і службы па землеўпарадкаванні, былы намеснік старшыні гарвыканкама, скарыстаўшыся службовым становішчам у карыслівых мэтах, арганізаваў выдзяленне на падстаўную асобу зямельнага ўчастка ў прэстыжным раёне Магілёва. «Каб мінімізаваць выдаткі на будаўніцтва на атрыманым участку ўласнага прыватнага дома, чыноўнік звярнуўся да дырэктара ААТ «Прамжылбуд» Леаніда Балдзенкі з просьбай прадаставіць яму без заключэння адпаведнага дагавора і аплаты неабходную спецыяльную тэхніку, грузавы аўтатранспарт, будаўнічыя матэрыялы, а таксама накіраваць на аб'ект рабочых будаўнічых спецыяльнасцяў», — паведамілі ў камітэце. Дырэктар прадпрыемства арганізаваў з кастрычніка 2007 года па кастрычнік 2009 года вытворчасць работ, звязаных з будаўніцтвам прыватнага дома. У выніку чаго ААТ «Прамжылбуд» быў нанесены ўрон у буйным памеры.

У судзе Уладзімір Ціток заяўляў пра тое, што не збіраўся выкрадаць будматэрыялы і думаў за іх разлічыцца. Аднак судовая калегія палічыла яго довады беспадстаўнымі, бо законных правоў на набыццё матэрыялаў у чыноўніка не было, а часткова пакрыць прычыненую шкоду абвінавачаны вырашыў толькі пасля ініцыяванай супрацоўнікамі КДБ праверкі ААТ «Прамжылбуд» кантралюючымі органамі.

У адпаведнасці з ч.2 арт.426 («Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў») і ч.3 арт.210 («Крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі») КК Беларусі Уладзіміру Цітку прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 3 гады з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых абавязкаў. Дырэктару будаўнічай арганізацыі Леаніду Балдзенку суд вынес аналагічны прысуд, але з адтэрміноўкай яго выканання на 2 гады. У бліжэйшы час ён будзе адхілены ад займаемай пасады. Прысуд суда Ленінскага раёна горада Магілёва пакінуты без змены, а касацыйныя скаргі абвінавачаных — без задавальнення.

# ЗАБОЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ



**У апошнія тыдні заходняя прэса і ліберальныя СМІ ўсяго свету са шчырай радасцю пісалі пра тое, што парламенцкія выбары ў Лівіі, на якіх перамаглі ліберальныя сілы, а не ісламісцкія партыі, сведчаць, што не ўсё так дрэнна для Захаду на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы пасля арабскіх рэвалюцый.**

А прычына для песімізму ў дачыненні да амерыканскіх і ў цэлым заходніх інтарэсаў у краінах з «дэмакратычнай» рэвалюцыяй ісламісцкага толку ёсць сур'ёзныя. Дастаткова ўспомніць гісторыю таго, як мусульмане-афганцы, якія «елі з рук» амерыканцаў у час вайны з СССР, тут жа павярнуліся супраць ЗША пасля вываду савецкіх войскаў.

Цвярозыя аналітыкі, у тым ліку айчынныя, папярэджвалі, што гэта глянцавая карцінка перамогі лібералаў у Лівіі — толькі вяршыня айсберга, што на самой справе новы ўрад мала што ў краіне кантралюе, паколькі ўлада на месцах сканцэнтравана ў руках добра ўзброеных неаднародных бандаў, якія мараць атрымаць сваю долю ад экспарту газу і нафты. Але Захадам гэта ў разлік не прымалася. Ён сур'ёзна ўспрыняў уласную лубачную карцінку, створаную падкантрольнымі яму СМІ.

Толькі гэта можа растлумачыць той факт, што ў разгар антызаходняй рыторыкі сярод мусульман, звязанай з правакацыяй амерыканскага кінематографа, пасол ЗША ў Лівіі адправіўся ў Бянгазі — яшчэ нядаўна надзейны аплот Захаду супраць улады палкоўніка Кадафі — у такі час і з такой нешматлікай аховай, дзе і быў забіты разам са сваёй світай. Гэта першае забойства пасла ЗША з 1979 года, і тое, што гэта адбылося ў краіне, у кантролі над якой амерыканцы былі цалкам упэўнены, з'яўляецца сур'ёзным сігналам для амерыканскіх інтарэсаў.

Разгубленасць амерыканскага ўрада была відавочнай — горшага сюрпрызу для Абамы напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, што набліжаюцца, не прыдумаеш. Да гэтага ён ішоў на іх дастаткова ўпэўнена ў вачах выбаршчыкаў з пункту гледжання знешняй палітыкі — Амерыка падтрымала «народныя масы» ў барацьбе супраць тыранічных рэжымаў Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі, кіраўнік Аль-Каіды забіты ў выніку спецаперацыі, што стала своеасаблівым актам помсты за тэракт 11 верасня 2001 года ў вачах амерыканцаў, войскі з Ірака ўдалося вывесці без неадкладнага падзення новага ўрада.

Калі б забойства пасла ЗША ў Лівіі здарылася ў былыя гады, калі там быў ва ўладзе Кадафі, лепшага падарунка амерыканскаму прэзідэнту зрабіць было б немагчыма. Тут жа былі б адпраўлены да берагоў краіны авіяносцы, набітыя ваеннай тэхнікай і салдатамі, і ўся магутнасць амерыканскага гневу абрынулася б на 5-мільённую краіну, забяспечыўшы ЗША хуткую помсту, а прэзідэнту — пераабранне ў выніку «маленькай пераможнай вайны» ў сувязі з такой сур'ёзнай прычынай.

Але ў часы Кадафі такога проста не магло адбыцца, паколькі палкоўнік цвёрда кантраляваў сітуацыю ў краіне і па ёй свабодна не разгульвалі банды з аўтаматамі, здольныя на такія анархічныя акты гвалту.

Горш за тое, высокапастаўленыя чыноўнікі з адміністрацыі прэзідэнта ЗША паспелі выказацца ў тым духу, што гэтае забойства можа быць справай рук «Аль-Каіды». Больш злашчаснай заявы для перспектыў Абамы на выбарах было цяжка зрабіць, што яшчэ раз сведчыць пра поўную разгубленасць каманды прэзідэнта.

Мала таго, што маштабна помсціць за забойства такога высокапастаўленага дыпламата ўласна няма каму, паколькі Лівія усцешана ўвагай амерыканскага істэблішменту, і ваяваць з ёй на фоне такога пазітыву проста немагчыма, дык яшчэ і атрымліваецца, што Абама губляе імідж прэзідэнта ЗША, які паставіў «Аль-Каіду» на калені, і лік зноў на яе карысць.

Як пераабрацца ў ЗША, калі ў краіне, якую амерыканскі прэзідэнт абвясціў новым сябрам амерыканскага народа, беспакарана забіваюць яе пасла, і што рабіць, калі гэта, магчыма, акт «Аль-Каіды», пра сваю перамогу над якой гэты ж прэзідэнт так доўга расказваў?

Усё, што можа зрабіць цяпер Абама, ён зрабіў — адправіў у Лівію атрад спецназа і два эсмінцы — з тым, каб дапамагаць лівійскаму ўраду злавіць забойцаў пасла. І, зразумела, якая-небудзь узброеная банда ў Лівіі будзе цяпер разгромленая і абвешчаная пасля гэтага вінаватай у сумных падзеях, але з пункту гледжання радавых амерыканцаў гэта не будзе годным адказам на акт насілля такога маштабу.

Зусім натуральна, што штаб праціўніка Абамы на выбарах — рэспубліканца Ромні — з прыхаванай радасцю ўспрыняў здарэнне. Сам Ромні тут жа паспрабаваў выставіць Абаму слабаком, не здольным эфектыўна кіраваць краінай і адстойваць амерыканскія нацыянальныя інтарэсы. Для гэтага ён выкарыстаў той факт, што на сайце пасольства ЗША ў Каіры перад забойствам пасла ЗША ў Лівіі з'явіліся прабачэнні за амерыканскі фільм «Нявіннасць ісламу», які негатыўна адлюстроўвае дзейнасць свяшчэннага для мусульман прарока Мухамеда.

Ромні абвінаваціў Абаму як у сімпатыях да ісламістаў, так і за гэтае прабачэнне, сказаўшы: «Я думаю, гэта жудасны шлях для Амерыкі — прасіць прабачэння за ўласныя каштоўнасці». Відавочна, для Ромні каштоўнасцю з'яўляецца патуранне тым грамадзянам ЗША, якія для чагосьці здымаюць абразлівыя для мусульман фільмы, у выніку якіх штурмуюць амерыканскія дыпмісіі за мяжой і забіваюць паслоў ЗША. Але, на жаль, многія грамадзяне ЗША разумеюць сапраўдную дэмакратыю і амерыканскія каштоўнасці менавіта так і падтрымліваюць Ромні на выбарах, якія маюць адбыцца.

**Сяргенй КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук.**

**ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 4 октября 2012 года проводит 15-й повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности от 18 сентября 2012 года на 16-ом открытом аукционе.**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 138 | Грузовой КамАЗ-4310 ш. 018317 дв. 887128 3 кат. 96 114 км | г. Полоцк в/ч 55719 | 1986 | 40 000 000 | 4 000 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, каб. № 637 **4 октября 2012 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 1 октября 2012 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи 4 октября 2012 г.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **10-ти** календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс (017) 278 09 98. Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.by.**

**ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»**
**4 октября 2012 года проводит 2-й повторный открытый аукцион от 28 января 2011 года по продаже имущества республиканской собственности на 15-ом открытом аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/наработка в м/ч (износ) | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка, (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 4/11 | Самолет Ан-24Б № 99902203, дв. Аи-24 с. 2 № Н4912105, дв. Аи-24 с. 2 № Н4012035, дв. ТГ-16 № АТ945005, 5 402 посадки, 3 КВР-1994 г. | г.п. Мачулищи, в/ч 06752 | 1969 | 5 118 | 1 317 000 000 | 131 700 000 |
| 6/11 | Вертолет Ми-26 № 34001212131, дв. Д-136 № 2251364001063, дв. Д-136 № 2251364001064, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 722А8В017 | г.п. Мачулищи, в/ч 06752 | 1987 | 594 | 9 733 000 000 | 973 300 000 |
| 7/11 | Вертолет Ми-26 № 34001212104, дв. Д-136 № 2251364001067, дв. Д-136 № 2251364001068, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 622А8В006 | г.п. Мачулищи, в/ч 06752 | 1986 | 593 | 8 984 000 000 | 898 400 000 |
| 8/11 | Вертолет Ми-26 № 34001212018, КАУ-140 № 82110014030, КАУ-140 № 821100140032, КАУ-140 № 821110140041, КАУ-140-01 № 821033010004, дв. ТА-8В № 042А8В058, 1 КВР-1990 г. | г.п. Мачулищи, в/ч 06752 | 1983 | 1 774 | 5 241 000 000 | 524 100 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, каб. № 637 **4 октября 2012 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы **до 17.00 1 октября 2012 года.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **4 октября 2012 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс (017) 278 09 98. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

19 верасня 2012 г.
№ 19 (291)


ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

## ЯК ЗНЕСЦІ, КАБ УРОНУ НЕ НАНЕСЦІ

**У нумары «МС» за 22 жніўня г.г. быў надрукаваны артыкул «Знос — справа тонкая», дзе змяшчаўся крытычны водгук старшыні Ветрынскага сельскага Савета дэпутатаў Полацкага раёна Аляксандра Свержа ў дачыненні да некаторых нормаў Указа № 100 (ад 23 лютага 2012 г.) «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці».**

Артыкул быў разгледжаны Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Рэспублікі Беларусь. У адказе, дасланым у рэдакцыю, паведамляецца, што *«...зыходзячы з артыкула 85 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, указы выдаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на падставе і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і маюць абавязковую сілу на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь...»*.

Пры распрацоўцы Указа № 100, гаворыцца далей, былі ўлічаны прапановы абласных выканаўчых камітэтаў, заснаваных на аналізе правапрымяняльнай практыкі рэалізацыі ў рэгіёнах нормаў Указа № 70 «Аб мерах па ўпарадкаванні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў з гаспадарчымі і іншымі пабудовамі ў сельскай мясцовасці» (ад 3 лютага 2006 г.). Нормы Указа № 100 былі ўзгоднены ва ўстаноўленым парадку з усімі зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, уключаючы Віцебскі абласны выканаўчы камітэт.

*«Такім чынам, Указ № 100 павінен безумоўна выконвацца на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, уключаючы тэраторыю Ветрынскага сельсавета, і ўсімі службовымі асобамі, уключаючы старшыню Ветрынскага выканаўчага камітэта»*, — чытаем у адказе.

Па канкрэтных пытаннях прымянення нормаў Указа № 100, вызначаных у артыкуле «Знос — справа тонкая», Дзяржкаммаёмасці паведамляе наступнае.

*«Пунктам 10 Указа № 100 непасрэдна прадугледжана, што старыя дамы, якія знаходзяцца ў сельскай мясцовасці, могуць быць знесены па рашэнні выканаўчага камітэта пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню са згоды ўласнікаў. Ні пра якое рашэнне суда пры наяўнасці згоды ўласніка на знос старога дома ва Указе № 100 размова не ідзе. Указ № 70, наадварот, зусім не прадугледжваў магчымасці зносу старых дамоў па рашэнні мясцовага выканаўчага камітэта.*

*...Па пытанні **«выдзялення грошай на знос»** адзначаем, што, у адпаведнасці з пунктам 19 Указа № 100, кіраўнік дзяржавы даручыў мясцовым выканаўчым камітэтам штогод падчас фарміравання праектаў мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год прадугледжваць сродкі для рэалізацыі гэтага Указа.*

*Што датычыцца сцвярджэння пра тое, што **«пошукі спадчыннікаў пустуючых дамоў ператвараюцца ў невыканальную задачу»**, а таксама скаргаў на складанасці дзейнай судовай працэдуры і прапановы аб **«аўтаматычным адабранні»** пустуючых жылых дамоў ва ўласнікаў, якіх **«са свечкай не знайсці»**, і ў іх спадчыннікаў, якія на працягу 7 месяцаў пасля смерці ўласніка жылога дома не ўступілі ў правы на спадчыну, адзначаем наступнае.*

*У адпаведнасці з артыкулам 44 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, дзяржава гарантуе кожнаму права ўласнасці і садзейнічае яе набыццю. Недатыкальнасць уласнасці, права яе атрымання ў спадчыну ахоўваюцца законам. Уласнасць, набытая законным спосабам, ахоўваецца законам. Прымусовае адабранне маёмасці дапускаецца толькі па матывах грамадскай неабходнасці пры захаванні умоў і парадку, вызначаных законам, са своечасовым і поўным кампенсаваннем кошту адчужанай маёмасці, а таксама ў адпаведнасці з пастановай суда.*

*У адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 1031 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь права атрымання спадчыны гарантуецца.*

*Падобныя нормы з'яўляюцца прававым базісам інстытута прыватнай уласнасці ў любой цывілізаванай дзяржаве. Таму заява пра ўстанаўленне асаблівага парадку **«аўтаматычнага адабрання»** жылых дамоў ва ўласнікаў і іх спадчыннікаў у абыход гэтых нормаў уяўляем безадказным.*

*Акрамя таго, артыкулам 1039 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь вызначана, што калі няма спадчыннікаў ні па законе, ні па завяшчанні, або ніхто са спадчыннікаў не мае права атрымаць спадчыну, або ўсе яны адмовіліся ад яе, — спадчына прызнаецца вымарачнай. Спадчына можа быць прызнана вымарачнай судом на падставе заявы органа мясцовага кіравання і самакіравання па месцы адкрыцця спадчыны пасля заканчэння аднаго года з дня адкрыцця спадчыны. Спадчына можа быць прызнаная вымарачнай да заканчэння ўказанага тэрміну, калі расходы, звязаныя з аховай спадчыны і кіраваннем ёю, перавышаюць яе кошт.*

*Неабходна адзначыць, што Указам № 100 прадугледжана магчымасць уключэння жылога дома ў рэгістр уліку пустуючых дамоў, што знаходзяцца ў сельскай мясцовасці, як пры наяўнасці яго ўласніка, так і пры яго адсутнасці — калі прынятымі захадамі па вышуку ўласніка не вызначаны яго асоба ці месца жыхарства.*

*Што датычыцца неабходнасці скарачэння тэрмінаў, якія адводзяцца ўласніку дома або родным «на раскачку», азначаем: у мэтах спрашчэння працэдуры адабрання пустуючых жылых дамоў ва Указе № 100, у параўнанні з Указам № 70, значна скарочаны тэрміны выканання дзеянняў, неабходных для рэалізацыі гэтай працэдуры...»*

Дзяржкаммаёмасці звяртае ўвагу на тое, што *«пры падрыхтоўцы праектаў указаў кіраўніка дзяржавы не толькі вывучаюцца правапрымяняльная практыка ў адпаведнай сферы прававога рэгулявання і прапановы зацікаўленых дзяржаўных органаў, але і праводзіцца аналіз магчымых наступстваў выдання ўказаў — у частцы іх уздзеяння на стан праваадносін у пэўнай галіне, сацыяльную абстаноўку, а таксама ўплыву на правы і законныя інтарэсы грамадзян.*

*Прадстаўнікі выканаўчых камітэтаў пярвічнага ўзроўню павінны ўсведамляць, што заканадаўчыя акты дзейнічаюць на тэрыторыі ўсёй краіны, а не толькі ў канкрэтным рэгіёне. Пры гэтым іх нормы выступаюць своеасаблівым кампрамісам інтарэсаў дзяржавы і насельніцтва ў мэтах забеспячэння нармальнай жыццядзейнасці грамадства. Таму няправільна сцвярджаць, што распрацоўшчыкі нарматыўных прававых актаў **«не прыслухаліся да «нізоў»** толькі на той падставе, што ў гэтых актах адсутнічаюць палажэнні, якія дакладна адлюстроўваюць канкрэтныя сітуацыі, а палажэнні не з'яўляюцца максімальна простымі для прымянення выканаўчымі камітэтамі — хоць бы і ва ўрон інтарэсам грамадзян».*

«КРУГЛЫ СТОЛ»

## КАБ ЧЫСТАЙ ВАДЗІЦЫ НАПІЦЦА...

Ілона ІВАНОВА

**У Княжыцкім сельскім Савеце дэпутатаў, што ў Магілёўскім раёне, прайшоў «круглы стол» па актуальнай тэме: «Чыстая вада — агульны клопат».**

Старшыня Магілёўскага абласнога Савета Уладзімір Панцюхоў прызнае: апошнім часам паболела зваротаў грамадзян, якія датычацца якасці вады, асабліва ў сельскай мясцовасці.

— Ад чысціні пітной вады залежыць наша здароўе — і гэта бясспрэчна, — сказаў кіраўнік дэпутацкага корпуса вобласці. — Але спрэчных пытанняў на гэты конт усё больш. Трэба разабрацца, у чым асноўныя праблемы, дзе ёсць недапрацоўкі.

Гэта быў не фармальны, а сапраўдны «круглы стол» з жывой дыскусіяй. Абмеркаванне ішло актыўна і эмацыянальна, хацелася выказаць свой пункт гледжання ўсім удзельнікам. А гэта былі старшыні гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў, прадстаўнікі выканаўчай улады, кіраўнікі адпаведных ведамстваў, а таксама памочнік Прэзідэнта, галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Лаўранкоў.

— Тут вялікай праблемы няма, вады ў нас дастаткова, — зазначыў Генадзь Міхайлавіч. — Але трэба вызначыцца, што вада — гэта наш дзяржаўны рэсурс, наша багацце. І што насельніцтва павінна атрымліваць якасную ваду.

На «круглым стале» з удзелам спецыялістаў разбіраліся самыя розныя пытанні: ад глабальных — як ставіцца да водных рэсурсаў і колькі іх спажыванне павінна каштаваць людзям, да самых надзённых — пра паліў сельскіх і дачных агародаў у летні перыяд. Напрыклад, уладальнікі садова-агародных участкаў нярэдка скардзяцца на вялікія рахункі за ваду (здараецца, і болей за 100 тысяч рублёў за месяц) у цёплы перыяд. Аказваецца, яны плацяць за паліў паводле спецыяльнага дагавора і ў адпаведнасці з даведкамі метэаролагаў: не было дажджу — заплаці за выкарыстанне вады паводле нормы. Што ж, скончыўся час, калі кемлівы чалавек мог дарма карыстацца вадой з калонкі паблізу для паліву ўласных палеткаў — цяпер у гэтай справе наводзіцца парадак.

Акрамя гэтага, у засуху і спякоту на карыстанне вадой у гаспадарчых мэтах з грамадскага водаправоду можа і павінна быць накладзена абмежаванне. Так калісьці давялося рабіць у адным з раённых цэнтраў вобласці, бо ў час актыўнага паліву агародаў вада ў жылых дамах да верхніх паверхаў не дабіралася, а людзям трэба жыць, піць, карыстацца выгодамі і гатаваць ежу.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

СЛУЖБА ДНІ І НОЧЫ

## ДВА ЎЧАСТКОВЫЯ НА АДЗІН СЕЛЬСАВЕТ

Святлана ЯСКЕВІЧ

**З участковым Вячаславам Наліўкам сустрэцца ў мінулую сераду не давялося. Ён ахоўваў... бомбы. На Пружаншчыне, дзе вяліся актыўныя баявыя дзеянні ў мінулую вайну, а ў пасляваенны час было шмат палігонаў, кожную восень збіраюць спецыфічны «ўраджай». Як пачалі капаць бульбу, убіраць буракі, так і пайшлі паведамленні: то авіяцыйную бомбу знайшлі, то неразарваны снарад. А парадак такі, што ў сельскай мясцовасці да прыезду сапёраў смертаносную знаходку ахоўвае ўчастковы міліцыянер.**



Старшыня Хараўскога сельскага Савета Таццяна ІЛЬЯШЭВІЧ, жыхарка Харавы Таццяна Самайловіч, участковы Міхаіл Пятрань.

У райаддзеле міліцыі паведамілі, што супрацоўнік Наліўка пільнуе бомбу пад Клепачамі. А калі дазваніліся да яго, то аказалася, што небяспечных знаходак ужо пяць. Сапёрная група пад'ехала толькі раніцай наступнага дня. Вячаславу давялося праседзець у полі да ночы. Такая служба. Участковы на яе не скардзіцца, як і на тое, што мінулы год давялося працаваць на два сельсаветы: Вялікасельскі і Мокраўскі. Надзвычай лаканічна акрэсліў Вячаслаў Наліўка сваю часовую работу на тэрыторыі, якая ўключала ў сябе каля 20 населеных пунктаў: «Нічога, даводзілася спраўляцца. Праўда, здаралася і па тры выезды за ноч».

Старшыня Мокраўскага сельскага Савета Святлана Ханавец сказала, што практыку абслугоўвання адным участковым двух участкаў можна разглядаць толькі як часовую, вымушаную меру. Як і было ў Мокрым. Кіраўнік мясцовай улады ўдзячна Вячаславу Наліўку за тое, што ён фактычна падмяніў калегу на працяглы час. Ніякіх прэтэнзій у старшыні да «суседскага» ўчастковага няма. Але ж у той перыяд ён выязджаў у вёскі Мокраўскага сельсавета толькі па факце здарэння, заявы, скаргі. А весці паўнавартасную прафілактычную работу ў такой колькасці вёсак аднаму чалавеку проста немагчыма.

— Работа з кантынгентам людзей, якія выклікаюць занепакоенасць, і ёсць галоўная задача міліцыянера на вёсцы, — разважае Святлана Мікалаеўна. — І не толькі п'яніцы, дэбашыры, непрацуючыя, ніядбайныя бацькі патрабуюць увагі. Ёсць яшчэ адна катэгорыя — пакінутыя старыя. Здавалася б, гэта крыху іншая праблема, больш сацыяльная. Але ў Мокрым так не лічаць, тут маюць свой падыход. Святлана Ханавец расказала сумную і, на жаль, характэрную гісторыю сям'і з адной маленькай вёсачкі. У хаце засталіся двое пенсіянераў — 1935 і 1941 гадоў нараджэння. Яны не столькі старыя, колькі хворыя, і не могуць належным чынам сябе абслугоўваць. У пакоях бруд, страшэнная антысанітарыя, за вячэрай муж і жонка, якія выгадавалі дваіх дзяцей, нярэдка абыходзяцца кавалкам хлеба. Сын жыве ў гэтым жа раёне, але з нявесткай адносіны не склаліся. А дачка з Лунінецкага раёна не лічыць патрэбным прыяжджаць і дапамагаць бацькам, хоць яны рэгулярна адпраўляюць ёй дзве свае пенсіі. Сабе пажылыя людзі пакідаюць сапраўдны мізэр на падтрыманне жыцця. У гэту сям'ю старшыня Савета пайшла менавіта з участковым інспектарам Мікалаем Заянчкоўскім. Відома, там складу злачынства няма і ніхто да адказнасці не прыцягнеш. Але ж Святлана Мікалаеўна ўлічвае і псіхалагічны фактар: бацькі паведамяць дзецям, што да іх прыходзілі з сельскага Савета, з міліцыі. Можа, хоць гэта скалыхне счарсцвелую душу — найперш — дачкі. Ёй, дарэчы, Святлана Ханавец напісала пісьмо з папярэджаннем, што бацькі будуць накіраваны ў бальніцу сястрынскага догляду, калі дзеці не навядуць належны парадак у іх доме.

А ёсць такія домаўладанні, куды прадстаўнікі мясцовай улады заходзіць без міліцыянера проста немэтазгодна. У вялікім Мокраўскім сельсавеце, у склад якога ўваходзяць тры аграгарадкі, 97 чалавек стаяць на ўліку ў нарколага.

Пастаяннымі сталі пасяджэнні савета па прафілактыцы пры сельвыканкаме. На разгляд савета матэрыялы рыхтуюць спецыялісты разам з участковымі. На адно з апошніх пасяджэнняў запрасілі непрацуючых грамадзян. Прысутнічалі таксама прадстаўнік Цэнтра занятасці, кіраўнікі мясцовых сельскагаспадарчых і іншых прадпрыемстваў. Кожнага грамадзяніна, які не атрымлівае працоўных даходаў і жыве найчасцей за кошт бацькоў, нярэдка састарэлых, калегіяльна ўшчувалі за асацыяльныя паводзіны, прапаноўвалі выйсце. У той раз удалося працаўладкаваць тры чалавекі. Прайшло два месяцы — пакуль што ўсе працуюць.

Зразумела, што кіраўнікі не вельмі хочуць браць у калектыў людзей з адпаведнага «кантынгенту». Але на тое і разлічвае старшыня сельскага Савета, што мудры кіраўнік разумее: чым менш парушальнікаў дысцыпліны побач, тым здаравейшы мікраклімат у калектыве ААТ ці СВК. І такое разуменне ёсць. Для сям'і Мікалая Заянчкоўскага выдзелілі дом з ліку так званых прэзідэнцкіх. Нядаўна гаспадарка набыла для апорнага пункта правапарадку камп'ютар. А рашэннем назіральнага савета ААТ «Жураўлінае» для патрэб міліцэйскай машыны выдзяляецца пэўны ліміт паліва. Практыка, калі гаспадаркі дапамагалі мясцовым участковым з бензінам, была і раней. Але адна справа, калі гэта рабіць нефармальна, на нейкіх асабістых кантактах, і адчуваць сябе абавязаным, і зусім іншая, калі ўсё афармляць законна і цывілізавана.

На тэрыторыі вялікага Мокраўскага сельсавета, які ў свой час быў утвораны з трох сельсаветаў, некалькі населеных пунктаў у бок Харавы абслугоўвае ўчастковы інспектар Хараўскога сельсавета Міхаіл Пятрань. Міхаіл Міхайлавіч — вопытны міліцыянер, на сваёй пасадзе працуе 16 гадоў. Людзей добра ведае, і яго тут ведаюць, і, трэба думаць, паважаюць. Такую выснову раблю на падставе таго, што давялося бачыць на свае вочы. Адзін з самых праблемных вясковых, якога ўчастковы Пятрань вёз у Пружаны, каб аформіць у лячэбна-працоўны прафілакторый, цярпліва чакаў, пакуль участковы гутарыў з карэспандэнтам. Хоць, мабыць, была спакуса збочыць і ўцячы агародамі ад прымусовай транспарціроўкі ў спецыфічную ўстанову...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

СЕСІЯ

## КОЖНАМУ КІРАЎНІКУ — ПА ТАНОМЕТРЫ, КОЖНАМУ ПРАДПРЫЕМСТВУ — ПА ПСІХОЛАГУ

**Днямі, зайшоўшы выпіць кавы ў «МакДональдс», назірала такую карціну. За суседнім столікам мама і бабуля, аб'яднаўшы намаганні, спрабавалі накарміць гамбургерам дзіця гадоў трох-чатырох. Адна адломвала кавалак і запіхвала яму за шчаку, другая падсоўвала (у якасці «бонусу») пад нос кока-колу. Малы штурхаўся і верашчаў, але ж хіба можна супрацьстаяць напору дзвюх клапатлівых жанчын?..**

Мы тое, што мы ядзім. А есці беларусы любяць памногу. Прычым у іх рацыёне па-ранейшаму пераважаюць прадукты прамысловай вытворчасці з высокай колькасцю жывёльных тлушчаў і цукру з аднаго боку і нізкай насычанасцю вітамінамі, мінеральнымі рэчывамі і харчовымі валокнамі — з другога.

У гэтым сэнсе жыхары Мінскай вобласці нічым не адрозніваюцца ад прадстаўнікоў іншых рэгіёнаў — яны таксама аддаюць перавагу хлебу і хлебабулачным вырабам, тлустым цэльнамалочным прадуктам, цукру і іншай «рафінаванай» ежы. Рыба, морапрадукты, садавіна і гародніна для значнай часткі насельніцтва рэгіёна застаюцца маладаступнымі — як па эканамічных прычынах, так і з-за звычак і стэрэатыпаў, якія складаліся дзесяцігоддзямі.

Але рацыён грамадзян даўно ўжо перастаў быць іх асабістай справай. Сярэднясутачная колькасць калорый, якую спажывае сярэднестатыстычны беларус, непакоіць зацікаўленыя ўладныя структуры і інстанцыі не менш, чым сярэднясутачны аб'ём прадукцыі, гэтым жа беларусам выраблены. Дадайце да калорый колькасць спіртнога, ужытага на «душу» насельніцтва (15,13 літра), і атрымаеце зусім не радасную агульную карціну... Нацыя беларусаў вымірае. Гэта факт, адмахнуцца ад каторага, як казаў герой класічнага твору, немагчыма.

Не могуць «адмахнуцца» ад яго і дэпутаты Мінскага аблсавета. Падчас апошняй сесіі яны абмеркавалі не толькі стан медыцынскай дапамогі ў вобласці, але і арганізацыю прафілактычнай работы па папярэджанні шэрагу захворванняў насельніцтва.

Першы намеснік начальніка ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама Сяргей Ганчароў канстатаваў, што хваробы сістэмы кровазвароту па-ранейшаму застаюцца самымі распаўсюджанымі на Міншчыне: кожны чацвёрты яе жыхар пакутуе ад артэрыяльнай гіпертэнзіі (павышанага артэрыяльнага ціску). І хоць медыка-дэмаграфічныя паказчыкі за 7 месяцаў гэтага года сведчаць аб некаторай стабілізацыі сітуацыі (колькасць памерлых знізілася на 82 чалавекі ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года), у цэлым падстаў для заспакаення мала. Сёлета 2669 чалавек памерлі, не дажыўшы да выхаду на пенсію — у працаздольным узросце.

— Асаблівая вострая праблема — смяротнасць у працаздольным узросце асоб мужчынскага полу, — паведаміў Сяргей Ганчароў. — Мужчын, якія памерлі ў актыўным узросце, у 4,5 раза больш, чым жанчын. А калі разглядаць гэты паказчык у «разрэзе» асобных захворванняў, дык розніца будзе яшчэ большай. Напрыклад, ад інфаркту міякарда працаздольныя мужчыны паміраюць у 6,8 раза часцей, чым жанчыны.

Ні для каго не сакрэт, што адзін з галоўных фактараў, якія негатыўна ўплываюць на працягласць жыцця, — злоўжыванне алкаголем: 37% асоб, якія памерлі заўчасна, пакутавалі на алкагольную залежнасць.

Разумеючы, да якіх незваротных наступстваў можа прывесці гэтая залежнасць у перспектыве, аблвыканкам ініцыяваў так званы «слуцкі эксперымент» — забарону продажу танных пладова-ягадных вінаў на тэрыторыі Слуцкага раёна, а пазней і на тэрыторыі некаторых іншых.

Сёння медыкі канстатуюць там пэўныя станоўчыя зрухі: павялічылася колькасць зваротаў да нарколагаў, зменшылася колькасць алкагольных псіхозаў, аздаравілася атмасфера ў сем'ях...

— Але як нельга пабудаваць камунізм у асобна ўзятай краіне, так і алкагалізм нельга перамагчы ў асобным рэгіёне. Калі мы сапраўды дбаем пра здароўе нацыі, неабходна дабівацца забароны вытворчасці нізкаякасных пладова-ягадных вінаў на тэрыторыі ўсёй рэспублікі, — лічыць Сяргей Ганчароў.

За сем месяцаў гэтага года ў вобласці вырасла колькасць суіцыдаў (262 выпадкі супраць 257 за такі ж перыяд мінулага года).

— Суіцыды — не толькі медыцынская праблема, гэта праблема ўсяго грамадства. Сёння ў большасці выпадкаў мы маем справу з парасуіцыдамі — калі чалавек толькі робіць спробу развітацца з жыццём, імкнучыся такім чынам звярнуць увагу на сябе і свае праблемы. Таму трэба быць больш уважлівымі адзін да аднаго, да сваіх родных, суседзяў, калег, падначаленых, падтрымліваць тых, у каго здарылася бяда, дапамагаць словам і справай, — звярнуўся да прысутных Сяргей Ганчароў. — Безумоўна, гэта датычыцца і дэпутатаў.

Старшыня Мінскага аблвыканкама Барыс Батура, які прымаў удзел у рабоце сесіі, параіў не абмяжоўвацца прэвентыўнымі захадамі ў пытаннях, ад якіх наўпрост залежыць дэмаграфічная сітуацыя ў краіне.

— Дэмаграфічная карціна далёкая ад аптымізму. Для аздараўлення нацыі неабходны сур'ёзныя захады на заканадаўчым узроўні. Сёння ў нас няма такіх захадаў, не акрэслены вастрыня і маштабнасць гэтай праблемы — і ў вобласці, і ў краіне ў цэлым... Пацікавіцца настроем ці самаадчуваннем суседа, аднавяскоўца, як вы тут прапануеце, безумоўна, можна. Але ж далёка не заўсёды той жа староста ці дэпутат сельскага Савета здолеюць у чужых праблемах разабрацца. Тут патрэбна дапамога спецыялістаў — за мяжой для гэтага існуюць спецыяльныя псіхалагічныя службы. Нам таксама неабходна пашыраць іх колькасць. Чаму ў школах псіхолагі ёсць, а, напрыклад, на прадпрыемствах іх няма? Паралельна трэба працаваць над змяненнем менталітэту нашага чалавека, каб ён не саромеўся да гэтых спецыялістаў і службаў звяртацца, каб ведаў, што яму там дапамогуць.

...Увогуле, неабыякавых выступленняў, цікавых прапаноў падчас сесіі прагучала шмат: ад забеспячэння ўстаноў і арганізацый усіх формаў уласнасці танометрамі да аб'яўлення тэрыторый усіх арганізацый і ўстаноў зонамі, свабоднымі ад курэння. Прысутныя сышліся на думцы, што прафілактыка — гэта комплекс папераджальных захадаў, заснаваны перш за ўсё на асабістай зацікаўленасці кожнага чалавека. Задача дэпутацкага корпуса — зрабіць так, каб у людзей гэтая зацікаўленасць з'явілася.

**Наталля КАРПЕНКА.**

**✓За мінулы (2011) год жыхары Мінскай вобласці 16 млн 950 тыс. разоў наведалі ўрачоў або выклікалі іх дадому — гэта 12 наведванняў на 1 жыхара вобласці за год.**

**✓На стацыянарных ложках пралечаны за мінулы год 391 тыс. хворых, або 28% насельніцтва вобласці (гэта высокі ўзровень шпіталізацыі). Сярэдні кошт аднаго ложка-дня ў стацыянарах — 233 тыс. рублёў: ад 112 тыс. рублёў у бальніцах сястрынскага догляду да 400 тыс. рублёў у абласной бальніцы.**

**✓Кошт 1 выкліку брыгады «хуткай дапамогі» складае ў вобласці 210 тыс. рублёў, сярэдні расход на 1 наведванне паліклінікі — 46 тыс. рублёў.**

**Зыходзячы з Глабальнага даклада Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, на кожнага жыхара нашай краіны за год прыпадае 15,13 літра алкаголю (або 12 літраў чыстага спірту). Беларусь упэўнена замыкае першую дзясятку краін па ўзроўні спажывання алкаголю. Першае месца ў гэтым спісе займае Малдова, дзе кожны жыхар выпівае ў сярэднім 18,22 літра алкагольнай прадукцыі ў год. У першую дзясятку таксама ўваходзяць Чэхія (16,45), Венгрыя (15,27), Расія (15,76) і Украіна (15,6).**

**«Асаблівасцю» Беларусі па-ранейшаму з'яўляюцца нізкія цэны на алкаголь.**

## БАЦЬКІ ПАТРЭБНЫ ДЗЕЦЯМ КОЖНУЮ ХВІЛІНКУ!

**З пачатку года пры пажарах на тэрыторыі краіны загінула 13 непаўналетніх дзяцей. Такія выпадкі адбыліся ў Мсціслаўскім, Жлобінскім, Валожынскім, Мёрскім, Ваўкавыскім, Ганцавіцкім і Шаркаўшчынскім раёнах... У большасці выпадкаў менавіта дзіцячае свавольства з агнём было прамой прычынай трагедый, а ўскосной — тое, што дзеці заставаліся без нагляду з боку дарослых...**

— Мы праводзім цэлы комплекс прафілактычных мерапрыемстваў, але галоўную ролю ў выхаванні дзіцяці ўсё ж павінна выконваць сям'я. Менавіта блізкія людзі — бацькі — павінны навучыць жыць бяспечна і не здзяйсняць неабдуманых учынкаў. Важна расказаць і патлумачыць малечы, як небяспечна гуляць з агнём, — расказалі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС. — У чарговы раз нагадваем: ні ў якім разе нельга пакідаць дзяцей адных, нават калі вы сабраліся выйсці толькі на хвілінку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАБ ЧЫСТАЙ ВАДЗІЦЫ НАПІЦЦА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Ну і, зразумела, ніхто нават і не спрачаецца, што за ваду трэба дысцыплінавана плаціць, і лепей гэта рабіць у адпаведнасці з дакладнымі паказаннямі лічыльнікаў. Цяпер мясцовыя ўлады і службы ўвогуле імкнуцца ўвесці строгую справаздачнасць у справе карыстання вадой: улічваць не толькі грамадскія крыніцы, але, напрыклад, і калодзежы на прыватных сельскіх падворках.

— У Магілёўскім раёне безгаспадарных калодзежаў няма, яны ўсе на ўліку, і ёсць графік іх рамонту, — сказаў прадстаўнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Вялікую праблему паўсюдна ўяўляюць сабой калодзежы ў малакалькасных вёсках альбо такіх, дзе жыхары з'яўляюцца толькі ўлетку: там малы разбор вады, яна застойваецца і, як мінімум, не мае добрага смаку. І калі дачнікі звычайна сочаць за такімі рэчамі сваёй талакой, то ў сельскай мясцовасці гэтае пытанне кладзецца на мясцовыя органы кіравання і самакіравання. Безумоўна, у многіх месцах калодзежы перададзены спецыяльным арганізацыям, але і сельвыканкамы не застаюцца ўбаку. Калодзежы трэба чысціць і рамантаваць, а калі яны зусім нікому не патрэбны — кансерваваць альбо ліквідаваць.

— У некаторых сельскіх раёнах створаны спецыяльныя брыгады, якія чысцяць калодзежы, — расказаў Уладзімір Панцюхоў. — Ёсць такі вопыт і ў Магілёўскай вобласці.

Праблемы малога разбору вады характэрныя не толькі для калодзежаў, але таксама для свідравін і водаправоду малых населеных пунктаў. Былі такія выпадкі, калі вяскоўцы скардзіліся на дрэнную якасць вады ў старых калодзежах і настойліва прасілі далучыць іх да выгодаў цывілізацыі. Пасля гэтага ў вёсцы будавалі водаправод, выдаткоўвалі вялікія грошы... але потым зноў ішлі скаргі на нясмачную ваду (з-за невялікіх аб'ёмаў спажывання яна зноў-такі застойвалася), і людзі вярталіся да правераных жыццём калодзежаў. Ёсць прапанова: тыя вёскі, дзе засталіся «жывыя» толькі дзясятак-другі хат, варта было б забяспечваць пітной вадой у бутэльках. Усё гэта трэба абмяркоўваць і пралічваць, лічаць удзельнікі «круглага стала».

Увогуле, вырашэнне праблем з забеспячэннем насельніцтва якаснай пітной вадой адбываецца ў адпаведнасці з абласной праграмай «Чыстая вада», разлічанай на перыяд 2011—2015 гадоў. Над яе выкананнем працуюць больш за два дзясяткі розных арганізацый. Яна прадугледжвае шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку пабудову свідравін, станцый абезжалезвання і вадапомпавых станцый , і на гэта павінна быць выдаткавана больш за 300 мільярдаў рублёў.

Планы вялікія, шмат чаго робіцца, але ўжо цяпер прадстаўнікі мясцовай улады заяўляюць (і з імі пагаджаюцца спецыялісты), што некаторыя мерапрыемствы трэба карэкціраваць і шукаць больш эканомныя і эфектыўныя шляхі, з улікам новых умоў і перспектыў развіцця паселішчаў. У кожным канкрэтным выпадку трэба прымаць сваё рашэнне, падыходзіць да праблем па-жыцейску: адной вёсцы ў тым жа Магілёўскім раёне патрэбна станцыя абезжалезвання, а іншай — падключэнне да водаправоднай сістэмы абласнога цэнтра, дзе падаецца вада, якая адпавядае ўсім дзейным нормам.

Яшчэ адна вялікая праблема — высокая колькасць жалеза ў вадзе, перавышэнне нормаў і, як неабходнасць, пабудова станцый абезжалезвання. Вада патрабуе дадатковай ачысткі, на гэта патрэбны мільярды рублёў. Таму найперш выпадае будаваць іх там, дзе жыве шмат людзей.

У Магілёўскім раёне выканкам вырашыў нават пабудаваць адну станцыю дадаткова, за сродкі мясцовага бюджэту. Станцыя абезжалезвання вельмі неабходна і Асіповічам. Плануецца, што ў хуткім часе (у 2013 годзе) тут пачнецца будаўніцтва і будзе ўзведзена такая станцыя.

— Гэта пытанне на кантролі, — пацвердзіў Генадзь Лаўранкоў.
— Я праводзіў там прыём грамадзян, дзе і абазначылі праблему. Будзем яе вырашаць.

У кожнага жыхара Беларусі, паводле закона, ёсць права на атрыманне якаснай пітной вады. Хаця ў кожнага свой погляд на тое, якую ваду спажываць — калодзежную, водаправодную ці ў бутэльках, фільтраваную альбо не. Спецыялісты, якія правяраюць якасць вады ў Магілёўскім цэнтры санітарыі і эпідэміялогіі, паведамілі, што яны, жыхары абласнога цэнтра, п'юць ваду з-пад крана: яна цалкам прыдатная для піцця і не нясе шкоды здароўю чалавека. Пробы робяцца рэгулярна, гэта інфармацыя даступная для спажыўцоў. Вадзе са значнай колькасцю жалеза можна хаця б даць адстаяцца, але праблему гэту, на думку спецыялістаў, усё ж трэба вырашаць абавязкова.

— Пытанняў шмат, і наша размова вельмі патрэбная, — падвёў вынік «круглага стала» Уладзімір Панцюхоў. — Гэту тэму мы яшчэ раз разглядзім на пасяджэнні пастаяннай камісіі абласнога Савета дэпутатаў, зробім афіцыйныя рэкамендацыі спецыялістаў. Каб праграма «Чыстая вада» працавала на карысць людзям.

— Сёння «на круглым стале» прагучала добрая думка: усё трэба лічыць і сумяшчаць жаданні і магчымасці, — сказаў журналістам Генадзь Лаўранкоў. — У маленькі населены пункт, можа, сапраўды прасцей вазіць ваду, таму што мільярды рублёў каштуе будаўніцтва водаправода ці прабіванне свідравіны. Іншая справа — з буйным горадам.

Самым простым шляхам эканоміі вады памочнік Прэзідэнта, галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці лічыць яе кошт. Не высокі і не нізкі, а адпаведны сапраўднаму. Акрамя гэтага, і ўведзеныя нормы (перавысілі — заплаціш больш, як вядома) ужо істотна знізілі спажыванне вады. Нам нагадваюць: будзем лічыць кожную капейку і берагчы кожную кроплю вады — будзем заможнай дзяржавай.

*Магілёўскі раён.*

**МЯСЦОВЫ ЧАС**

# «ЖЫВЫЯ» ГРОШЫ

**На тэрыторыі Рубілкаўскага сельскага Савета Дзяржынскага раёна 24 населеныя пункты і 1304 чалавекі насельніцтва. Буйныя вёскі — Томкавічы, Баравікі, Пабеднае і Курганне. Усяго ж зарэгістравана 409 асабістых падсобных гаспадарак, дзе сярод іншага ўтрымліваецца 58 кароў.**

Многа гэта ці мала? Усё, як той казаў, пазнаецца ў параўнанні. Яшчэ 9 гадоў таму ў прыватных гаспадарках было 360 рагуль. І здавалі грамадзяне дзяржаве каля 3300 кілаграмаў малака з падворка ў год.

— Цяпер мы арыентуем уладальнікаў, каб было здадзена не менш за 2 тыс. кілаграмаў малака ад каровы штогод. І гэтыя паказчыкі выконваюцца, — распавёў старшыня Рубілкаўскага сельскага Савета Міхаіл Маскаль. — Сёлета закупілі на адну карову 1372 кілаграмы малака — на 246 больш, чым у адпаведны леташні перыяд. У цэлым па сельсавеце за 7 месяцаў з пачатку года з прыватных гаспадарак сабралі 79,6 тоны малака. — На тону больш да леташняга ўзроўню.

Рэгулярна пытанні развіцця падсобных гаспадарак абмяркоўваюцца на пасяджэннях выканкама, сесіях сельскага Савета з удзелам кіраўніцтва філіяла «Праўда-Агра» ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі». Раней збор малака з прыватнага сектара ажыццяўлялі павозкамі. Апошнія гады — малакавозам, які выдзеліла гаспадарка. Гэта дазволіла значна павялічыць прадукцыйнасць працы і скараціць час дастаўкі прадукцыі на перапрацоўку. Больш за тое, машына не абмінае ніводнай вёскі, заходзіць нават у тыя, дзе ўтрымліваюцца толькі адна-дзве каровы. За здадзеную прадукцыю з насельніцтвам своечасова разлічваюцца праз банк.

Тлустасць малака правяраецца непасрэдна на месцы ў гаспадарцы. А раз на дзесяць дзён лабарантка філіяла Святлана Мешыч аб'язджае вёскі і бярэ кантрольныя індывідуальныя пробы малака. За кілаграм залікавага малака чалавек атрымлівае 2555 рублёў. Так што гаспадары, асабліва тыя, што трымаюць 2 каровы, за лета маюць нядрэнны дадатковы прыбытак да сямейнага бюджэту.

— Праблем з кармамі таксама няма, — падзяліліся са мной мясцовыя жыхары. — Філіял забяспечвае свойскую жывёлу сенам першага ўкосу, летняй пашай. Там, дзе пагалоўя няшмат, на ўскрайку вёскі выдзяляецца ўчастак і абгароджваецца звычайным ланцугом. А, напрыклад, у Томкавічах і Старышчы кароў пасвяць з дапамогай электраабсталявання. Трава пастаянна падкошваецца, а туды, дзе няма прыродных ці штучных вадаёмаў, дастаўляецца вада спецыяльнай машынай. Яшчэ ніхто не збыў карову на мясакамбінат з-за недахопу кармоў.

І ўсё ж пагалоўе жывёлы ў асабістых прыватных гаспадарках з кожным годам змяншаецца. Па-першае, вясковае насельніцтва старэе, а моладзь не хоча браць на сябе дадатковы клопат.

— А навошта? — шчыра здзіўляецца мясцовая жыхарка Святлана. — Жывёла патрабуе пастаяннага догляду. А гэта і фізічныя высілкі, і фінансавыя ўкладанні. Трэба не толькі ўстаць на золку, каб падаіць кароўку, але і стойла, яслі вычысціць. Часу на гэта не хапае, паколькі ездзім на работу ў Мінск.

Дабрацца да сталіцы не праблема — усяго 20 кіламетраў. Пад бокам раённы цэнтр, Фаніпаль, дзе пастаянна патрабуюцца рабочыя рукі. Ды і філіял «Праўда-Агра» — стабільная ў эканамічным плане гаспадарка. Тут таксама нядрэнныя заробкі. І чалавек можа купіць усе неабходныя прадукты харчавання ў краме.

— У глыбінцы, дзе няма буйных прадпрыемстваў, праблема з работай, ды і зарплаты невялікія, для мясцовых жыхароў падсобная гаспадарка — ледзь ці не адзіная крыніца заробкаў . А ў насельнікаў прыгарадных тэрыторый з гэтым праблем няма. Таму і менш становіцца жывёлы ў прыватным сектары, — да такога вываду прыйшла мая суразмоўца.

На яе думку, і закупачная цана на сельгаспрадукцыю не надта высокая. А ў магазіне хоць і каштуе малако больш за пяць тысяч рублёў за літр, тым не менш даступнае для насельніцтва.

Як заўважыў старшыня сельвыканкама, пасля таго, як на маладняк закупачны кошт павысілі з 25 тысяч рублёў за кілаграм жывой вагі да 35 тысяч, мясцовы люд прыкметна актывізаваўся. Калі летась здалі каля 20 цялят, то сёлета за 7 месяцаў ужо 29. І ёсць надзея, што з пачаткам ацёлаў у 4 квартале гэты паказчык павялічыцца.

— У раёне распрацаваны план мерапрыемстваў па развіцці сялянскіх падворкаў, які прадугледжвае шматлікія стымулы, у тым ліку і забеспячэнне свойскай жывёлы кармамі. У мінулым годзе сельгасарганізацыі выдзелілі прыватным гаспадаркам 688 тон сена і 393 тоны саломы. У сярэднім на карову атрымалася 1139 кілаграмаў. У філіялах «Пяцігор'е», «Праўда-Агра», «Фалько-Агра», адкрытым акцыянерным таварыстве «Кастрычніцкая рэвалюцыя», камунальным сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве «Логавішча-Агра» нават больш. А ў ААТ «Негарэльскае» і «Баравое-2003» — больш за дзве тоны. Для ўтрымання жывёлы выдзелены 391 гектар пашы і 115 гектараў сенакосу. Для паляпшэння месцаў выпасу затрачана больш за 42 млн рублёў. Гэта падкошванне і падкормка травы, падвоз вады, агароджа, электраабсталяванне. Насельніцтву аказваецца дапамога па апрацоўцы прысядзібных участкаў, наладжана ветэрынарнае абслугоўванне жывёлы, праводзіцца яе прафілактычны агляд, — распавёў старшыня Дзяржынскага раённага Савета дэпутатаў Уладзімір Марыновіч.

Комплекс мерапрыемстваў, бясспрэчна, уплывае на прадукцыйнасць прыватнага статка. За сем месяцаў гэтага года ў насельніцтва закуплена звыш 416 тон малака — амаль на 13 тон больш за леташні ўзровень.

Не апошнюю ролю ў закупе лішкаў прадукцыі адыгрывае і матэрыяльнае заахвочванне. У раёне наладжана спаборніцтва сярод здатчыкаў і зборшчыкаў малака, лабарантаў, старшынь сельскіх Саветаў і кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў. У прыватнасці, гаспадаркі, якія закупілі не менш за 80% цялят ад агульнай колькасці кароў, што ўтрымліваюцца ў прыватным сектары, прэміруюцца ў памеры 20 базавых велічынь. У тым ліку кіраўнік атрымлівае 8 базавых, а спецыялісты, якія займаліся закупкай, — 12.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗВАЛІЛІСЯ З БАЛКОНА

**У Брэсце два мужчыны зваліліся з аварыйнага балкона другога паверха.**

— Недзе з поўдня гэтыя грамадзяне знаходзіліся ў гасцях у кватэры па вуліцы Савецкіх Пагранічнікаў. Распівалі спіртныя напіткі, — распавялі падрабязнасці здарэння ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. — Калі выйшлі з кватэры пакурыць на балкон, абаперліся аб металічную агароджу балкона. У выніку яна абрынулася — разам з мужчынамі — на зямлю. Стан аднаго пацярпелага цяжкі, другога — сярэдняй ступені цяжару.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДВА ЎЧАСТКОВЫЯ НА АДЗІН СЕЛЬСАВЕТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Дарэчы, год таму Міхаіл Пятрань па выніках работы быў прызнаны лепшым участковым у вобласці і атрымаў узнагароду ад губернатара. Як чалавек з вялікім досведам, Міхаіл Міхайлавіч разважае, чаму маладыя не вельмі ахвотна ідуць на пасаду ўчастковых. Па-першае, зарплата невысокая, а па-другое, вельмі клапатлівая работа. За ўсё ты адказваеш на сваёй тэрыторыі: грамадска-палітычная кампанія ці масавае мерапрыемства — павінен забяспечыць парадак, бомбу знайшлі ці нешта надзвычайнае здарылася — участковы ў любую пару, удзень і ўначы, тут як тут. Ну і пастаянная руцінная работа, якая называецца прафілактыкай. Зараз на ўчастку Міхаіла Петраня жыве чацвёра грамадзян, якія вызваліліся пасля адбывання тэрміну за цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы. Гэтыя людзі знаходзяцца пад асаблівым назіраннем. І ўсё ж, паводле слоў участковага, 90% работы складае разборка заяў і скаргаў вяскоўцаў. Калі раней людзі крыху саромеліся заяўляць на суседа, чыя курыца зайшла ў агарод, то цяпер ёсць і такія звароты. І ўсё патрэбна разбіраць, часам мірыць бакі. Але асабліва складанымі выглядаюць сямейныя канфлікты, калі бацькі маюць прэтэнзіі да дзяцей альбо дзеці да бацькоў. П'янства, злачыннасць як сямейныя хваробы нярэдка перадаюцца ад пакалення да пакалення, і працаваць з такімі сем'ямі асабліва цяжка. «Тут можна разлічваць на нейкі прагрэс толькі ў цесным кантакце з органамі мясцовай улады», — робіць выснову ўчастковы.

Пакуль мы размаўлялі з Міхаілам Петранём, пад'ехала старшыня Хараўскога сельскага Савета Таццяна Ільяшэвіч. Таццяна Аляксееўна была пад уражаннем ад наведвання мясцовай выпівохі Зінаіды. Старшыня Савета прыгразіла, што развесіць здымкі нядбайнай гаспадыні і яе «апартаментаў» па ўсіх суседніх вёсках, і дастала фотаапарат. Тады Зіна ўзмалілася, ледзь не на каленях упрошвала не рабіць гэтага. Таццяна Аляксееўна паставіла ўмову: зараз жа выліць на зямлю адкаркаваную бутэльку гарэлкі. І кабета выліла спіртное. Міхаіл Пятрань заўважыў, што для Зіны гэта не проста мужны, гэта гераічны ўчынак. Паводле яго назіранняў, у мужчын ёсць хоць некаторы шанц пераадолець цягу да алкаголю, жанчыны ж лячэнню амаль не паддаюцца. Таму самая страшная навала грамадства — жаночае п'янства. І яно, на жаль, не абышло вёску.

Начальнік Пружанскага раённага аддзела ўнутраных спраў Дзмітрый Няхаеў сказаў у гутарцы з карэспандэнтам «МС», што яму не раз даводзілася бываць на саветах прафілактыкі, сесіях мясцовых Саветаў, з чаго можна зрабіць выснову: узаемадзеянне ўчастковых інспектараў з сельсаветамі ажыццяўляецца на належным узроўні:

— Таму спрыяе і пазіцыя райвыканкама. Усе ўчастковыя па меры патрэбы атрымалі службовае жыллё. Гэта вельмі важна. Ёсць адпаведнае рашэнне райвыканкама, якім рэкамендавана сельгаспрадпрыемствам у вызначаным парадку дапамагаць з палівам для службовых машын. У многіх на месцах склаліся такія добрыя кантакты, што рэйдавыя мерапрыемствы кіраўнікі гаспадарак і ўчастковыя ладзяць пастаянна — зыходзячы з аператыўнай абстаноўкі.

Сёлета ў раёне фіксуецца зніжэнне злачыннасці на 40% у параўнанні з мінулым годам. Гэтаму паспрыяла, па-першае, заканчэнне будоўлі цэлага шэрагу аб'ектаў. З раёна выехала ў свае вобласці і свае краіны прыкладна тысяча наёмных рабочых. Па-другое, запрацаваў Закон аб прафілактыцы. Механізм узаемадзеяння розных ведамстваў, які некалькі гадоў апрабоўвалі, атрымаў рэальныя абрысы. У тым ліку ўзаемадзеянне з мясцовымі органамі ўлады стала больш дзейсным і выніковым.

* * *

Пружанскі раён быў выбраны для камандзіроўкі па вывучэнні ўзаемадзеяння службы ўчастковых з мясцовымі органамі ўлады выпадкова, як кропка на карце. І аказалася, што тут работа пастаўлена ў асноўным так, як павінна быць. Доўга заставалася адкрытай вакансія ўчастковага ў Зеляневіцкім сельсавеце, і тую нядаўна закрылі. Але і тут у размове са сталымі супрацоўнікамі даводзілася чуць, што маладыя не вельмі ахвотна згаджаюцца на такую работу: зарплата невысокая, работа цяжкая. А на інтэрнэт-форумах былыя супрацоўнікі заклікаюць параўнаць зарплату міліцыянера ў нас і, скажам, у суседняй Расіі. Таму і нядзіва, што з памежных рэгіёнаў некаторыя міліцыянеры едуць працаваць у краіну-суседку.

Да таго ж вельмі нялёгкая работа — быць участковым. Часта працуюць яны без выхадных, выязджаюць на начныя выклікі. Апошнім часам узрасла і колькасць дакументаў, якія трэба абавязкова весці ўчастковаму міліцыянеру. Ёсць цэлы шэраг нехарактэрных, нетыповых задач, якія ўскладзены на ўчастковага. Ну вось, напрыклад, з той жа ахovай боепрыпасаў. Бомбы аказаліся на нашай зямлі ў выніку ваенных дзеянняў. Логіка падказвае, што ўсе пытанні з ліквідацыяй наступстваў вайны знаходзяцца ў кампетэнцыі ваенных камісарыятаў. Але прасцей бывае прыцягнуць да гэтай работы чалавека ў пагонах, якім на вёсцы з'яўляецца ўчастковы міліцыянер.

*Пружанскі раён.*

**ІНІЦЫЯТЫВА І ПРАДПРЫМАЛЬНАСЦЬ**

# САКАВІТЫ ЧАС

**Зараз у сям'і Кавалёвых з Дубая вельмі напружаны час — жыхары раёна масава вязуць яблыкі на перапрацоўку. Перапрацоўка соку — сезонная справа. Пачынаецца яна звычайна ў дзясятых чыслах жніўня і заканчваецца, пры добрых абставінах, у канцы лістапада.**



Андрэй Джонавіч Кавалёў у сваім міні-цэху.

Штодня збіраецца чарга каля памяшкання ў двары Кавалёвых. Першапачаткова гаспадар — прыватны прадпрымальнік Андрэй Джонавіч — імкнуўся весці запіс ахвотных перапрацаваць садавіну на сок, але так і не змог: адзін запісаны прывозіць дзясятак мяхоў, а іншы з сабою прывязе яшчэ і суседзяў. Таму цяпер чарга «жывая», у жніўні-верасні пачынаецца з 12 гадзін і працягваецца да позняга вечара. Яблычны сок карыстаецца папулярнасцю асабліва сёлета, калі яблыкаў шмат у кожным двары. Людзі вязуць іх разам з грушамі, кабачкамі, гарбузамі ці вінаградам, каб нарыхтаваць смачны вітамінны напітак на зіму.

У жніўні дапамогу ў сямейнай справе Андрэю Джонавічу і Алене Васільеўне аказвалі сыны — Антон і Альберт, якія з пачаткам навучальнага года паехалі працягваць вучобу. Антон — студэнт педагагічнага ўніверсітэта, будучы настаўнік фізічнай культуры, Альберт — навучэнец Баранавіцкага каледжа лёгкай прамысловасці. Дапамагае і дачка Таццяна, якая працуе эканамістам у мясцовым СВК. Таццяна — таксама студэнтка, але завочнага аддзялення. Вось і даводзіцца бацькам круціцца, каб падняць дзяцей на ногі. Дзеці як ніхто з'яўляюцца стымулам для развіцця.

Ідэю перапрацоўваць садавіну і агародніну на сок падалі Кавалёвым людзі. Напачатку Андрэй выціскаў сок для сябе, маючы прэс. Пасля даведаўся пра тэхналогію перапрацоўкі, набыў спецыяльнае абсталяванне. Справа пачыналася з малога — прывозілі сельгаспрадукцыю суседзі, знаёмыя. Даў рэкламу ў раённай газеце — сталі прыязджаць людзі з іншых населеных пунктаў. Але самая лепшая рэклама — гэта тое, што пра цябе гавораць. Так з вуснаў у вусны перадавалася, што ў Дубаі выціскаюць з яблыкаў сок.

Чацвёрты сезон працуе міні-цэх па перапрацоўцы. Гаспадары прымаюць партыі сыравіны ад 30 кілаграмаў. Да яблыкаў многія дадаюць яшчэ якую-небудзь садавіну ці гародніну, каб палепшыць смак соку. Алена Васільеўна як вопытная гаспадыня дае рэкамендацыі пачаткоўцам: колькі цукру пакласці, у якіх прапорцыях лепш змяшаць. Напрыклад, рэкамендуе да двух мяхоў яблыкаў дадаць вядро вінаграду. Калі ж дадаць і гарбуз, дык атрымаецца сок, падобны па смаку на яблычнаслівовы.

З мяха яблыкаў — 30 кілаграмаў — атрымліваецца каля 20 літраў соку. Кошт работы — мыццё, здрабненне, выцісканне на спецыяльнай цэнтрыфузе — 700 рублёў за адзін кілаграм прадукцыі. Людзям зручна: прывёз мяхі — забраў гатовы сок. Жамерыны ад яблыкаў адвозяць звычайна на ферму ў СВК.

Заўжды напружаны час для перапрацоўшчыкаў пасля вялікага ветру ці буры. Так было тыдзень таму. Тады сям'і Кавалёвых давялося некалькі дзён працаваць да гадзіны ночы.

Цяпер Андрэй Джонавіч і Алена Васільеўна ў працоўным водпуску. Алена Васільеўна — сацыяльны работнік, а Андрэй Джонавіч — інжынер па працаёмкіх працэсах мясцовага СВК.

У «несакавіты час» яны яшчэ займаюцца размолам мукі. Гэта таксама сезонная справа, якая пачынаецца звычайна пасля прыезду людзей з заробкаў і заканчваецца ў маі. Таму дзве справы не перашкаджаюць адна другой.

Перад паездкай у Дубай патэлефанавала старшыні Відзіборскага сельвыканкама Адаму Пятровічу Кудласевічу. Пачула толькі станоўчыя водгукі аб сям'і Кавалёвых. Андрэя Джонавіча ён характарызаваў як разумнага і кемлівага гаспадара, які не звык сядзець на адным месцы, а заўжды праяўляе ініцыятыву і прадпрымальнасць.

**Таццяна СЕГЕН. Фота аўтара.**

*Столінскі раён.*

## КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ

***Не так даўно мяне прызналі інвалідам другой групы. Спадзяваўся, што пасля гэтага буду мець ільготы па аплаце жыллёва-камунальных паслуг. Аднак мне ў іх адмовілі ў сувязі з тым, што жыву я не адзін, а з жонкай, якая працуе. Ці правільна гэта?***

**В.Ц.,** *г. Рагачоў.*

